Ціхі азёрны гарадок цяпер нагадвае вялізную будаўнічую пляцоўку — Глыбокае прыхарошваецца. Менавіта сюды прыйдзе шлях «Дарогі да святыняў», што з'яўляецца неад'емнай часткай Дня беларускага пісьменства. СТАР 3

Першы нумар «Звязды» выйшаў у 1917 годзе, а Валянціна Адамаўна нарадзілася ў 1922-м. Сёлета ў абедзвюх юбілей: Валянціне Адамаўне 5 жніўня спаўняецца 90 гадоў, а «Звяздзе» — 95. СТАР 4

Калі ўязджаеш у Вільнюс з боку Беларусі — то шлях нібыта сам вядзе да гэтай брамы, якая стала сімвалам горада. За ёй хаваюцца стагоддзі, за ёй тое, што хочацца спасцігнуць і зразумець. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЖНІЎНЯ 2012 г. СУБОТА № 149 (27264) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПАЙШЛО-ПАЕХАЛА...

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ СЯРГЕЯ МАРТЫНАВА З АЛІМПІЙСКІМ ЗОЛАТАМ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў беларускага стралка Сяргея Мартынава з заваяваннем залатога медаля на Алімпіядзе-2012 у Лондане, а таксама з устанаўленнем новага сусветнага рэкорду.**

«Сардэчна віншую цябе з яркім выступленнем, якое прынесла першы залаты медаль у скарбонку беларускай каманды на летніх Алімпійскіх гульнях 2012 года. Перакананы, што твая перамога натхніць нашых алімпійцаў на новыя спартыўныя дасягненні», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сваім выступленнем Сяргей Мартынаў прынёс радасць усім аматарам спорту, прадэманстраваў сілу духу і сапраўднае майстэрства. Як раней паведамлялася, у сённяшніх спаборніцтвах майстроў стральбы з малакалібернай вінтоўкі з трох становішчаў лежачы на 50 м 44-гадоваму беларусу не было роўных. У кваліфікацыйным турніры ён атрымаў безагаворачную перамогу, устанавіўшы новы сусветны рэкорд — 600 ачкоў. У фінальным раўндзе спаборніцтваў Сяргей Мартынаў зноў быў намнога мацнейшы за сваіх апанентаў, яшчэ раз палепшыўшы сусветнае дасягненне з сумай 705,5 бала.

Гэта ўжо трэцяя алімпійская ўзнагарода беларускага стралка — да гэтага ён двойчы заваёўваў бронзавыя медалі ў Сіднеі-2000 і Афінах-2004. Усяго ён прымаў удзел у шасці Алімпіядах, прычым на чатырох з іх трапляў у фіналы. Акрамя алімпійскіх узнагарод у Сяргея Мартынава два званні чэмпіёна планеты (2006, 2010) і золата еўрапейскага першынства 1997 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ДАРУЧЫЎ СТВАРЫЦЬ СУЧАСНЫЯ ПЛОДААГАРОДНІНАСХОВІШЧЫ Ў АБЛАСНЫХ ЦЭНТРАХ І МІНСКУ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч даручыў стварыць у абласных цэнтрах і Мінску як мінімум па адным плодаагароднінасховішчы па аналогіі са сховішчам, дзеючым на КСУП «Камбінат «Усход» у аграгарадку Урыцкае ў Гомельскім раёне. Такую задачу кіраўнік урада паставіў учора ў час рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць, перадае БЕЛТА.**

«Мною прынята рашэнне, каб у бліжэйшыя два гады як мінімум па адным такім комплексе пабудаваць у кожнай вобласці і Мінску, што вырашыць пытанне не толькі захоўвання плодаагароднінай прадукцыі, але і яе глыбокай перапрацоўкі і пастаўкі ў выглядзе паўфабрыкатаў для нашых грамадзян», — заявіў прэм'ер-міністр.

Новыя комплексы дадуць магчымасць таксама паспяхова развіваць і экспарт традыцыйных для Беларусі сельгаскультур, такіх як бульба, буракі, морква і іншыя. «Выкарыстоўваючы гомельскі праект, мы можам гаварыць, што амаль 50 працэнтаў выраблена прадукцыі можна будзе рэалізоўваць на экспарт», — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

Астатнія рэгіёны павінны падхапіць гэты паспяховы прыклад і як мага хутчэй пачаць праектаванне і будаўніцтва новых плодаагароднінасховішчаў, узяўшы за аснову праект КСУП «Камбінат «Усход». «Мы ва ўрадзе з Мінфінам і банкамі акажам садзейнічанне ў выдзяленні льготных валютных крэдытаў на гэтыя мэты», — заявіў Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў, першае такое плодаагароднінасховішча пачнуць у бліжэйшы час праектаваць, а затым і будаваць у Мінску. Пры рэалізацыі такіх праектаў важна ўвязваць іх з сыравіннымі зонамі, каб сфарміраваўся замкнуты тэхналагічны ланцужок, уключаючы нарыхтоўку і глыбокую перапрацоўку. Рэалізацыя праектаў дапаможа паспяхова арганізаваць экспарт традыцыйнай для Беларусі плодаагароднінай прадукцыі.

ФІНАНСАВЫ ТЫДЗЕНЬ

## ДОЛАР ПЕРАСТАЎ ПАДАЦЬ

**І еўра пачаў расці дзякуючы, напэўна, таму, што ўжо другі тыдзень Марыя Драгі, кіраўнік Еўрапейскага цэнтральнага банка, запэўнівае ўсіх, што ніколі не дазволіць еўра знікнуць, што гатовы да «прыняцця захадаў нестандартнай грашова-крэдытнай палітыкі».**

Такім чынам, за тыдзень еўра дадаў 30 рублёў (плюс 0,3%) і цяпер каштуе 10180. Долар падаражэў на 80 рублёў (плюс 1%) да 8340. Курс расійскага рубля застаўся без змянення. Нейкіх значных ваганняў курсу нашай нацыянальнай валюты ў бліжэйшы час, хутчэй за ўсё, не адбудзецца. За паўгода, па звестках Белстата, сальда знешняга гандлю склала амаль 2 мільярды долараў (1,99) — таму валюты хапае, тым больш што ўвосень попыт на яе зменшыцца.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

london-2012.com

Сяргей МАРТЫНАЎ, алімпійскі чэмпіён па стральбе:

## «Пра сусветныя рэкорды на агнявым рубяжы не задумваюся...»

**Учарашні залаты поспех ветэрана стралковага спорту Сяргея МАРТЫНАВА стаў заканамерным вынікам натхнёнай і ўпартай працы за амаль 30-гадовую кар'еру. Беларус у практыкаванні 50 метраў лежачы ў кваліфікацыйным заліку набраў 600 балаў з абсалютна лепшым паказчыкам, устанавіўшы 7-ы сусветны рэкорд, а па выніках фінальнай стральбы — сусветны і алімпійскі рэкорд у суме, набраўшы 705 ачкоў. З такімі арыфметычнымі раскладкамі наваспечаны алімпійскі чэмпіён з'явіўся ў мікс-зоне, дзе быў нарасхват журналістаў.**

**— Віншуем з першым алімпійскім золатам. Што яно значыць для вас асабіста і для ўсёй беларускай каманды?**

— Думаю, што вы гэта ведаеце не горш за мяне. Для нашай краіны — гэта пачатак паспяховага выступлення. Дай Божа, каб пасля гэтага быў хуткі працяг. А для сябе... Безумоўна, вельмі шчаслівы і задаволены тым, што дасягнуў такога выніку.

**— З дому вас паспелі павіншаваць жонка, дочкі, сябры?**

— Не ведаю. Тэлефон разрываецца ад званкоў, аднак паглядзець яго яшчэ не было калі. Трэба допінг-кантроль прайсці, а потым ужо буду прымаць віншаванні.

**— Тое, што ўстанавілі сусветны і алімпійскі рэкорды, паспелі ўсвядоміць?**

— Ведаеце, калі я выходжу на пазіцыю ў стралковым ціры, то ні пра якія рэкорды не задумваюся. Галоўнае — паказаць той вынік, які дапаможа апярэдзіць сапернікаў.

**— На гэты раз у вас быў даволі істотны адрыў ад канкурэнтаў. Па ходзе фіналу паглядвалі на вынікі суседзяў?**

— На гэтым не зацыкліваўся, у стральбе ў любым выпадку ўсё залежыць толькі ад цябе асабіста. Пачнеш траціць сваю ўвагу на іншае — можаш страціць канцэнтрацыю, і тады змажаш у бок мішэні. А гэта, калі хочаш дабіцца высокага выніку, — недапушчальна.

**— Сяргей, сённяшняе месца фіналу для вас вельмі знаёмае. Вясной, здаецца, вы тут былі на перадалімпійскім тыдні.**

— Так, гэты стралковы цір я ўжо «абкатаў» сёлета ў красавіку на перадалімпійскім тыдні, які праходзіў у Лондане.

**— Вы выступалі толькі ў адным раздзеле стралковай праграмы. Вынік дасягнуты. Што далей?**

— Білет на Мінск у мяне куплены на 8 жніўня. Таму зараз збіраюся наведаць якія-небудзь спаборніцтвы. У прыватнасці, хочацца трапіць на плаванне. І калі Саша Герасіменя трапіць у фінал на дыстанцыі 50 метраў вольным стылем, то з задавальненнем пагляджу гэты заплыў.

**— Знаёмства з Лонданам не плануецца?**

— Мінулы раз я даволі цесна пазнаёміўся са сталіцай Вялікабрытаніі, таму цяпер траціць час на турызм не хацелася б. Тым больш што ёсць магчымасць падтрымаць сваіх калег, землякоў. Пастараюся скарыстацца адведзеным часам максімальна карысна для сябе і для каманды.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.** *Лондан.*

## Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Лондана

Учарашні дзень на Алімпійскіх гульнях у Лондане быў надзвычай багатым на падзеі. Поспех Аляксандры Герасімені, прэс-канферэнцыя з якой завяршылася пасля поўначы, залаты медаль стралка Сяргея Мартынава сталі сапраўдным падмуркам для далейшага ўзыходжання на спартыўны Алімп беларускіх атлетаў. Гэтыя падзеі адбыліся на фоне заявы беларускага боку наконт зняцця з дыстанцыі Іван Ціхана і каментарыяў наконт сумніўных білетаў, знойдзеных у Нарвегіі, якія прызначаліся для заўзятараў з Беларусі. І віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль Тозік, і віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Сяргей Цяцерын назвалі гэтыя абвінавачванні абсурднымі. На сустрэчы з журналістамі было падкрэслена: ніякіх білетаў, адзін з якіх паказаны на фатаграфіях, беларускі НАК не атрымліваў. Сёння ж усе білеты, якія зараз дастаюцца беларусам у адпаведнасці з квотай, размяркоўваюцца сярод акрэдытаваных спартсменаў, трэнераў, членаў афіцыйнай дэлегацыі.

Між тым скандалы і плёткі не шкодзяць беларускай камандзе набіраць абароты. У вячэрняй праграме па беларускім часе ў вагавой катэгорыі да 75 кг выступала наша цяжкаатлетка Ірына Кулеша, а ўслед за жаночым фіналам пачаўся мужчынскі (да 85). Тут Беларусь прадстаўляў сярэбраны прызёр Пекіна Андрэй Рыбакоў. Познім вечарам пачаўся фінал у штурхальнікаў ядра, дзе адзіным прадстаўніком Беларусі стаў Павел Лыжын. На жаль, чэмпіён свету і прызёр Алімпійскіх гульняў у гэтай дысцыпліне Андрэй Міхневіч не прайшоў кваліфікацыйныя спаборніцтвы. Следам за жанчынамі на памост выйшлі мужчыны. З надзеяй на ўдачу.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.** *Лондан.*

**Калі вярстаўся нумар.** ***Адна з беларускіх надзей учора ўсё ж спраўдзілася — Ірына КУЛЕША заваявала бронзу!***

*ЛІЧБА ДНЯ*

## 5 МЛН ТОН ЗБОЖЖА

***сабрана ў Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання. Паводле аператыўнай інфармацыі, на 3 жніўня збожжавыя і зернебабовыя культуры ў цэлым па рэспубліцы ўбраныя на плошчы 1 млн 363 тыс. га, што складае 56,1 працэнта да плана ўборкі. Валавы збор збожжа перавысіў 5,2 млн т. У прыватнасці, сельгасарганізацыі Мінскай і Брэсцкай абласцей намалацілі 1,179 млн т і 1,111 млн т адпаведна. У Гродзенскай вобласці сабрана 998 тыс. т збожжа, у Гомельскай — 785,6 тыс. т, Магілёўскай — 656,7 тыс. т, Віцебскай — 499,1 тыс. т.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 25° |
| Віцебск | + 27° |
| Гомель | + 28° |
| Гродна | + 25° |
| Магілёў | + 26° |
| Мінск | + 29° |

Аляксандра ГЕРАСІМЕНЯ, сярэбраны прызёр Алімпіяды ў плаванні:

## «Я да канца яшчэ не зразумела, што са мной адбылося»

**Сярэбраны поспех вядомай беларускай плыўчыхі Аляксандры Герасімені быў сапраўдным падарункам для ўсёй беларускай дэлегацыі. Яшчэ б: алімпійская ўзнагарода ў плаванні — першая для суверэннай Беларусі. А для Аляксандры гэта яшчэ і вынік доўгіх гадоў трэніровак. Пасля заканчэння спаборніцтваў дзейная чэмпіёнка свету на дыстанцыі 100 метраў з'явілася ў мікс-зоне з добрым настроі і радаснай усмешкай.**

**— Саша, як ацэньваеш свой вынік? Ты па ходзе дыстанцыі была ў лідарах. Здаецца, што да перамогі не хапіла зусім крыху?**

— А я на перамогу і настройвалася. А чаго баяцца і перад чым пасаваць? Усе сапернiцы па заплыве — жывыя людзі, многія з якіх малодшыя за мяне. Так што намеры былі самыя сур'ёзныя. Увогуле, усё склалася выдатна і я вельмі задаволена дасягнутым вынікам. Хоць разлічвала на больш «хуткія» секунды.

**— За іншымі ўдзельніцамі заплыву сачыла?**

— Толькі на першых 50 метрах. Далей ужо я глядзела, калі выдыхала, у супрацьлеглы бок, таму нікога не магла бачыць.

**— Табе не прывыкаць плыць па крайняй дарожцы. Хоць больш прэстыжнымі і выгаднымі лічацца сярэднія.**

— Не сказала б. Урэшце, справа не ў дарожцы, а ў тым, як ты падрыхтавана да спаборніцтваў і што можаш паказаць на дыстанцыі.

**— Шчыра кажучы, заплывы ў кваліфікацыі і паўфінале ў душы кожнага з беларускай каманды паслялі апаску: ці можна з сёмым вынікам разлічваць на ўдачу?**

— Фінальныя заплывы — гэта асобная тэма. Тут іншая раскладка, іншая псіхалогія, асаблівы настрой. Няважна, з якім вынікам ты сюды трапіў.

СТАР 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІІ ПРАПАНАВАНА ПАВЫСІЦЬ ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ

Міжнародны валютны фонд прапанаваў Расіі павялічыць пенсійны ўзрост для мужчын і жанчын — да 63 гадоў к 2030 году і да 65 гадоў к 2050-му. Пра гэта заявіў кіраўнік расійскага прадстаўніцтва МВФ Од Пёр Брэк. Цяпер жанчыны ў РФ выходзяць на пенсію ў 55 гадоў, мужчыны — у 60. Брэк растлумачыў, што пенсійныя выдаткі расійскага бюджэту складаюць 8% ВУП, што, паводле яго слоў, адпавядае ўзроўню развітых краін. Аднак да 2050 года з улікам пенсійнага ўзросту і дэмаграфічных праблем гэтыя выдаткі павялічацца да 18% ВУП.

### ХУДЗЕЙЦЕ З РАДАСЦЮ

Першая ў свеце парфума, якая дапамагае знізіць вагу, створана французскімі парфумерамі. Парфума Prends-moi ад швейцарскай маркі Velds была выраблена французскім домам Robertet. Толькі ў Вялікабрытаніі ў чаргу па запаветны флаканчык ужо запісаліся больш як 6 тысяч жанчын. У склад парфумы ўваходзяць рэчывы, якія пры нанясенні на скуру вылучаюць эндарфіны, або гармоны радасці. Як толькі яны трапляюць у мозг, у чалавека паляпшаецца настрой і знікае жаданне перакусіць. Тэсціраванне распрацоўкі паказала, што 75% жанчын ва ўзросце ад 18 да 70 гадоў, якія карысталіся парфумай, перасталі адчуваць патрэбу ў «перакусе». Таксама 70% удзельніц эксперымента заявілі, што адчулі ўздзеянне навінкі на сваё стаўленне да ежы. Прадстаўнікі Robertet сцвярджаюць, што пры дапамозе Prends-moi жанчыны будуць «худзець з радасцю».

### У ШВЕЦЫІ ПАБІЛІСЯ ЗБОРШЧЫКІ ЯГАД

Дзве групы зборшчыкаў ягад агульнай колькасцю прыкладна 70 чалавек учынілі масавую бойку ў горадзе Еўле ў цэнтральнай частцы Швецыі. Паліцыя мяркуе, што прычынай канфлікту стала барацьба за ягады, паколькі гэтым летам у Швецыі вельмі дрэнны ўраджай. У бойцы прынялі ўдзел мігранты з Балгарыі, якіх запрасілі на сезонную працу па зборы ягад у Швецыю. У сярэдзіне ліпеня шведскія СМІ паведамлялі, што невядомыя злачынцы, магчыма, звязаныя з гандлем людзьмі, запрасілі ў Швецыю некалькі дзясяткаў балгараў на заробкі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЭНЕРГЕТЫЧНЫХ РЭСУРСАЎ ХОПІЦЬ НА 40 ГАДОЎ

У 2050 годзе Зямлю чакае экалагічная перагрузка, збядненне рэсурсаў і голад. Да такога выніку чалавецтва прыйдзе, калі захаваце цяперашнія тэмпы нараджальнасці.

На думку экспертаў, трагічнага зыходу можна пазбегнуць, калі дзяржавы аб'яднаюць свае рэсурсы. Ідэя стварэння для пераразмеркавання рэсурсаў агульнасусветнай планавай эканомікі з'явілася яшчэ ў 90-х гадах. Аднак дэталёва яна не распрацавана дагэтуль: не зразумелы механізм выбару прадстаўнікоў краін і спосаб агульнага кіравання. На думку віцэ-прэзідэнта расійскага Цэнтра стратэгічных камунікацый Дзмітрыя Абзалава, свет рухаецца менавіта да такой сістэмы, аднак ідзе па іншым шляху: праз стварэнне буйных рэгіянальных блокаў. Для таго, каб чалавецтва не знішчыла Зямлю, таксама неабходна павысіць эфектыўнасць засваення рэсурсаў.

Паводле прагнозаў ААН, да 2050 года насельніцтва Зямлі дасягне 9 мільярдаў, а да канца стагоддзя складзе 10,1 мільярда чалавек. Пры гэтым захаваецца тэндэнцыя прыросту колькасці людзей у асноўным за кошт самых бедных краін. Эксперты сцвярджаюць, што самай густанаселенай дзяржавай стане Індыя, якая абгоніць Кітай. Што да еўрапейскіх краін і шэрагу іншых развітых дзяржаў, то іх народанасельніцтва будзе скарачацца.

КАРОТКА

Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа алімпійскага рэзерву № 13 па стралковым спорце па рашэнні наваспечанага алімпійскага чэмпіёна атрымае Br100 млн у рамках праекта «Алімпійскі выбар», які рэалізуецца Прэзідэнцкім спартыўным клубам пры падтрымцы Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму.

У Беларусі захоўваецца станоўчая тэндэнцыя павелічэння нараджальнасці, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Так, у першым паўгоддзі бягучага года ў рэспубліцы нарадзіліся 54,2 тыс. дзяцей — на 3,4 тыс. нованароджаных больш (на 6,6 працэнта) у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Паводле слоў спецыялістаў, радуе, што рост нараджальнасці адзначаны як у гарадскіх паселішчах (на 7,5 працэнта), так і ў сельскай мясцовасці (на 3,8 працэнта).

Дзяржаўтаінспекцыя правядзе тыднёвую акцыю па кантролі за бяспечнай перавозкай дзяцей «Дзіця — галоўны пасажыр!». Акцыя стартуе 6 жніўня і прадоўжыцца на працягу тыдня да 12 чысла.

## НЯДАЎНА КОБРЫН АДЗНАЧАЎ СВАЁ 725-ГОДДЗЕ. ЗА ШТО ВЫ ЛЮБІЦЕ СВОЙ ГОРАД?

**Любоў ТРУБЧЫК, майстар участка ЖКГ «Зелянгас»:**

— Я люблю людзей наогул, люблю дзяцей, люблю прыроду і, вядома, свой горад. Кожны дзень мы азеляняем, упрыгожваем Кобрын, натуральную яго прыгажосць дапаўняем і падкрэсліваем кветкамі, якія вырошчваем у сваёй гаспадарцы. Як асабістую крыўду я ўспрымаю паводзіны асобных гараджан, якія не шануюць чысціню і парадак, а самі засмечваюць набярэжную ракі, паркі і скверы. І ўсё ж такіх несвядомых людзей становіцца ўсё менш: агульныя намаганні ўлады і грамадскасці па выхаванні культуры даюць пэўныя плады. І гэта дае падставу ганарыцца сваім горадам.

**Віктар ВЫШЫНСКІ, вадзіцель масларобна-сыраробнага завода:**

— Як карэнны кабрынчанін у некалькіх пакаленнях, добра ведаю свой горад. А пасля «Дажынак» 2009 года райцэнтр проста расквітнеў. Сям'ёй мы часта ходзім у аквапарк. На святы і выхадныя гуляем у нашым старадаўнім парку імя Суворава. У нас ёсць куды пайсці вечарам і людзям сярэдняга пакалення, і моладзі, і такім падлеткам, як мая 14-гадовая дачка. Кругом чысціня, прыгажосць, утульнасць — паглядзіце самі!

**Аліна САЗОНАВА, пенсіянерка:**

— Сама я данская казачка, але ўжо 50 гадоў жыву ў Кобрыне, бацька-вайсковец прывёз нас сюды пасля вайны. Таму Кобрын лічу родным горадам, тут прайшлі лепшыя гады жыцця, выраслі дзеці, працавала ў розных установах, камунікавала з рознымі людзьмі. Горад палюбіла ўсёй душой. Мне падабаецца, што тут шануюць гістарычную памяць. З Кобрынам звязаны падзеі вайны 1812 года і Вялікай Айчыннай, а таксама асоба генералісімуса Суворава. І ўсё знаходзіць дастойнае ўвасабленне ў музеях. Яшчэ ў Кобрыне вельмі добразычлівыя, ветлівыя людзі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

## НАГЛЯДАЛЬНІКІ АД СНД НЕ ВЫЯВІЛІ ПАРУШЭННЯЎ

**Місія назіральнікаў ад СНД не выявіла парушэнняў пры фарміраванні акруговых выбарчых камісій на парламенцкіх выбарах у Беларусі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў штабе Місіі назіральнікаў ад СНД.**

У рамках маніторынгу парламенцкіх выбараў назіральнікі азнаёміліся з работай акруговых выбарчых камісій гарадоў Мінска і Магілёва, Мінскай і Віцебскай абласцей. «Фарміраванне камісій прайшло ў адпаведнасці з Каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў. У склад камісій увайшлі як прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, так і простыя грамадзяне. Камісіі забяспечаны неабходнымі для работы метадычнымі дапаможнікамі. Ва ўстаноўленыя Выбарчым кодэксам тэрміны былі зарэгістраваны ініцыятыўныя групы», — расказалі ў штабе. Члены штаба місіі прынялі ўдзел у пасяджэнні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

## УСТАНОЎЛЕНЫ НОВЫЯ СТАЎКІ АКЦЫЗАЎ НА АЛКАГОЛЬ, БЕНЗІН І ДЫЗПАЛІВА

**У Беларусі з 1 жніўня па 31 снежня 2012 года ўстаноўлены новыя стаўкі акцызаў на алкаголь, бензін і дызпаліва. Такое рашэнне змешчана ва ўказе № 349 ад 31 ліпеня 2012 года, тэкст якога размешчаны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Беларусі, паведамляе БЕЛТА.**

Згодна з дакументам, на спірт этылавы з харчовай сыравіны, спірт сінтэтычны ўстаноўлена стаўка акцызу ў памеры Br21 620 за 1 літр бязводнага (стапрацэнтнага) этылавага спірту, які змешчаны ў гатовай прадукцыі, на алкагольную прадукцыю з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і больш (за выключэннем спірту, він пладовых мацаваных марачных, палепшанай якасці і спецыяльнай тэхналогіі, він фруктова-ягадных натуральных, він натуральных, у тым ліку пеністых, шампанскіх, газіраваных і шыпучых, сідру, піва і піўнога кактэйлю, спіртазмяшчальных растворaў) — Br77 680, на віны пладовыя мацаваныя марачныя, палепшанай якасці і спецыяльнай тэхналогіі — Br37 280. Стаўка акцызу на віны фруктова-ягадныя натуральныя, сідры фруктова-ягадныя з 1 жніўня бягучага года складае Br580 за 1 літр гатовай прадукцыі, на віны натуральныя, у тым ліку пеністыя, шампанскія, газіраваныя і шыпучыя — Br3 520.

Акрамя таго, устаноўлены новыя стаўкі акцызаў на слабаалкагольныя напіткі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту большай за 1,2 працэнта і меншай за 7 працэнтаў (слабаалкагольныя натуральныя напіткі, іншыя слабаалкагольныя напіткі), віны з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў, сідры (за выключэннем фруктова-ягадных). У прыватнасці, на слабаалкагольныя натуральныя напіткі ўстаноўлена стаўка акцызу Br47 130 за 1 літр бязводнага (стапрацэнтнага) этылавага спірту, які змешчаны ў гатовай прадукцыі, на іншыя слабаалкагольныя напіткі, віны з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў — Br71 410, на сідры (за выключэннем сідраў фруктова-ягадных) — Br1 940 за 1 літр гатовай прадукцыі. На спіртазмяшчальныя растворы з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і больш, за выключэннем адпушчаных арганізацыям Беларусі для вытворчасці безалкагольных напіткаў, устаноўлена стаўка акцызу ў памеры Br77 680 за 1 літр бязводнага (стапрацэнтнага) этылавага спірту, які змешчаны ў гатовай прадукцыі.

Таксама з 1 жніўня 2012 года ўстаноўлены новыя стаўкі акцызаў на бензіны аўтамабільныя: з актанавым лікам 95 і вышэй — Br1 026 000 за 1 тону, з актанавым лікам ад 91 да 95 — Br1 286 690, з актанавым лікам да 91 — Br1 459 220. Стаўка акцызу на дызельнае паліва з 1 жніўня складае Br826 540, на дызельнае паліва, адгружанае (адпушчанае) для вытворчасці біядызельнага паліва, устаноўлена ў памеры Br0.

## ЭКВАТАР МАГІЛЁЎСКАГА ЖНІВА

У Магілёўскай вобласці ўбралі больш за палову пасяўных плошчаў. Агульны намалот у сельскіх гаспадарках набліжаецца да мільёна тон збожжа. Самая высокая ўраджайнасць у Шклоўскім раёне, дзе з гектара ў сярэднім атрымліваюць 52 цэнтнеры. Далей у гэтым спісе ідуць Магілёўскі і Круглянскі раёны. Найбольшая колькасць экіпажаў камбайнаў, якія намалацілі больш за тысячу тон, у Кіраўскім раёне — там іх 11. Увогуле ў Магілёўскай вобласці цяпер 48 «тысячнікаў».

**Ул. інф.**

## АДКРЫВАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА ВАДАПЛАЎНУЮ І БАЛОТНУЮ ПТУШКУ

З другой суботы жніўня (сёлета гэта 11-е чысло) у краіне стартуе і будзе доўжыцца па другую нядзелю снежня (9 чысло) сезон паляванне на вадаплаўную дзічыну (акрамя гусей) і балотную, слонку, вехіра, шызага голуба, перапёлку (любога полу і ўзросту).

Як паведаміў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей, паляванне будзе дазволена ў светлы час сутак зброевым спосабам, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі (усе групы, акрамя ганчакоў і выжлаў), з падыходу, з засады, з вабікам, з пад'езду з маламерных суднаў (без рухавіка ці з непрацуючым рухавіком), з выкарыстаннем гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў з дробам, а таксама бяззброевым спосабам з выкарыстаннем лоўчых птушак.

Парушэнне правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання можа пацягнуць накладанне штрафу ў памеры ад 10 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй зброі і іншых прылад палявання або без канфіскацыі з пазбаўленнем спецыяльнага права.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АБЗАЦ

Ноччу 2 жніўня маларыцкім памежнікам паступіла інфармацыя, што цераз мяжу ў абход пункта пропуску ў аўтамабілі «Мерседэс-Спрынтар» будзе перапраўлена партыя мяса. Сумесна з супрацоўнікамі міліцыі быў арганізаваны пераслед аўтамабіля. Ён спрабаваў уцячы і ехаў па трасе Маларыта — Ружаны спачатку па тэрыторыі Кобрынскага, Бярозаўскага, а затым Пружанскага раёна. Толькі ў Пружанскім раёне паблізу ад Ружан аўтамабіль быў затрыманы, а непадалёк ад Браткавіч таго ж раёна знайшлі 15 выкінутых туш. Асоба кіроўцы ўстанаўліваецца. Не выключана, што гэта гаспадар транспартнага сродку — 27-гадовы жыхар Кобрына.

**У Маладзечанскім раёне міліцыя вывела з незаконнага абарачэння і знішчыла 12 т алкагольнага сурагату. У в. Талуі супрацоўнікі міліцыі ў закінутым доме знайшлі 6 тыс. л брагі і самагонны апарат. У в. Малая Барковічына ў хляве непрацуючага мясцовага жыхара — 20 л самагонкі, 5,4 тыс. л брагі і апарат. Былі знаходкі і ў іншых населеных пунктах.**

2 жніўня ў вёсцы Бабоўка Жлобінскага раёна загінуў на пажары шасцігадовы хлопчык. Аб узгаранні гаспадарчай пабудовы выратавальнікам паведаміў сусед. На месцы супрацоўнікі МНС убачылі, што дашчаная пабудова, запоўненая саломай, ахоплена полымем. Пры ліквідацыі пажару ў памяшканні знойдзена цела сына гаспадара дома — хлопчыка 2006 года нараджэння. Бацька на момант пажару знаходзіўся ў аэрапорце — праводзіў дачку на аздараўленне ў Італію. Маці была ў гасцях на суседняй вуліцы. У сям'і — восем дзяцей, яна характарызуецца як паспяховая. Пажарныя абследавалі дом сёлета ў ліпені, парушэнняў не было выяўлена. Папярэдняя прычына пажару — дзіцячыя гульні з агнём.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ



**Незвычайную карціну ў літоўскім мястэчку Жэмайчу Наўямесціс зафіксавала тамтэйшая журналістка. У старэнькім аўтамабілі VW Golf везлі... дзвюх жывых цялушак. Паводле яе слоў, каровы былі відавочна не задаволеныя такой паездкай. «Бедныя, яны кідаліся. І ездзіць на машыне не надта ўмее, тармозіць. Яны, бедныя, б'юцца адна аб адну, нам шкада стала», — расказала відавочца.**

Помнік драўлянай лыжы ўстановяць у Беразіно. Яго адкрыццё прымеркавалі да свята-конкурсу «Бярэзінскія лыжачнікі», які пройдзе 11 жніўня. Вышыня помніка разам з пастаментам — 3,5 метра. Над вырабам самай вялікай лыжкі Беларусі працавалі 3 майстры. Выраб, упрыгожаны ўзорамі, плануецца размясціць на ўездзе ў горад.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# «Я да канца яшчэ не зразумела, што са мной адбылося»

Фота БЕЛТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— У сваіх шматлікіх размовах з журналістамі ты не перастаеш казаць, што на зборах і спаборніцтвах шмат чытаеш. На гэты раз не змяняла сваёй традыцыі?**

— Прызнаюся, што чытаць не было калі, хоць кнігі са мной ёсць. Усе памкненні і думкі былі накіраваны на медаль.

**— Няўзброеным вокам было відаць, што ты вельмі хутка стартавала. Гэта твой козыр?**

— Не сказала б, што я дабіваюся поспеху выключна за кошт таго, што хутчэй за іншых пакідаю стартавую тумбу. Хоць удалы старт — гэта нямала ў дасягненні выніку. Мы адпрацоўваем рэакцыю на трэніроўках. Ведаеце, у плаванні важна «не праспаць» старт і не скочыць у ваду раней судзейскага сігналу, за што можна атрымаць дыскваліфікацыю.

**— Калі б зараз у цябе была магчымасць пераплыць па-новаму ў фінале, выйграла б яго?**

— Мне здаецца, што я выйграла б. У мяне яшчэ ёсць шанц пазмагацца за золата на дыстанцыі 50 м вольным стылем. І яго пастараюся выкарыстаць. Праўда, для гэтага трэба паспяхова прайсці кваліфікацыю і паўфінальныя заплывы. Думаю, што зрабіць гэта мне па сілах.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.** *Лондан.*

# ЦІХАН ВЯРТАЕЦЦА

Афіцыйнае паведамленне штаба беларускай зборнай на Алімпійскіх гульнях у Лондане аб тым, што да спаборніцтваў не будзе дапушчаны неаднаразовы чэмпіён свету і прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне Іван Ціхан, не прывёў журналістаў у шок. Мы ўжо ведалі, што нешта сенсацыйнае павінна быць сказана для беларускіх журналістаў менавіта ў той вечар, калі Аляксандра Герасіменя павінна была стартаваць на сваёй кароннай дыстанцыі — 100 метраў вольным стылем. Седзячы за камп'ютарамі ў Міжнародным прэс-цэнтры, мы заўважылі, што да беларусаў раз-пораз пачалі падыходзіць замежныя калегі з рознымі намёкамі. Маўляў, чуткі ходзяць, што ў вас наспяваюць праблемы з допінгам. Другое пытанне — у Нарвегіі арыштаваны білеты на Лонданскую алімпіяду, якія прызначаліся Нацыянальнаму алімпійскаму камітэту Беларусі. Ну, а калі прэс-аташэ Міністэрства спорту Рэспублікі Беларусі Уладзімір Несцяровіч папрасіў беларускіх журналістаў быць у Аквацэнтры, дзе пасля фінішу Герасімені будзе зроблена афіцыйная заява віцэ-прэм'ера Анатоля Тозіка, стала зразумела: настаў час даведацца ўсю праўду, а не жыць чуткамі.

Выйшла так, што зусім не радасная прамова Анатоля Апанасавіча супала з радаснымі падзеямі, якія здарыліся ў басейне. Дзейная чэмпіёнка свету стала сярэбраным прызёрам. Таму сваё выступленнем перад прадстаўнікамі айчынных СМІ куратар беларускіх алімпійцаў пачаў з аптымістычнай ноты. Мы рады, сказаў ён, што ў паўфінал тэніснага турніру прабілася Вікторыя Азаранка. Наша Саша (Герасіменя. — **Аўт**.) паказала выдатны вынік для сябе і для краіны, у фінал выйшла Кацярына Карстэн. А цяпер пра сумнае, засяродзіў увагу прысутных віцэ-прэм'ер нашага ўраду. На жаль, наша федэрацыя лёгкай атлетыкі вымушана зняць са спаборніцтваў кідальніка молата Івана Ціхана па патрабаванні Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі. Яе рашэнне заснавана на паўторным аналізе пробы, узятай у беларуса яшчэ на Алімпійскіх гульнях 2004 года ў Афінах. Яна паказала наяўнасць забаронена прэпарата. Якога — не ведаем, бо ніякага пісьмовага пацвярджэння на наш адрас не паступала. Як кажуць, без каментарыяў, заключыў А. Тозік.

Анатоль Апанасавіч яшчэ раз нагадаў, што мы спадзяваліся на залаты медаль Івана, але вымушаны былі пайсці на гэты крок, каб не падстаўляць усю нацыянальную каманду. Крыўдна: нам паведамілі аб тым, што ў афінскай пробе знойдзены забаронены прэпарат, 29 ліпеня. У той час, калі Іван ужо збіраўся ў Лондан. І для таго, каб яму можна было сабраць неабходныя тлумачэнні, што ён у той час лячыўся, прымаў пэўныя лекі, у яго проста не было часу. Адказ трэба было даць да 31 ліпеня. Зразумела, што просьбы Івана даць яму час, засталіся толькі просьбамі. Замест гэтага яго адхілі ад спаборніцтваў.

У працяг гэтай невясёлай тэмы віцэ-прэзідэнт НАКа Беларусі Сяргей Цяцерын сказаў, што чалавеку не далі шанцу на апраўданне, таму ніякай размовы аб спартыўнай этыцы, спартыўным прынцыпе справядлівасці і проста чалавечнасці быць не можа. Тым больш што Івана Ціхана правяралі на допінг у Мінску перад Алімпіядай. На сёння, заключыў Сяргей Цяцерын, Івану рэкамендавана пакінуць алімпійскую вёску. Зразумела, што ў такой сітуацыі застаецца толькі падпарадкавацца патрабаванням Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі, каб пазбегнуць розных магчымых непрыемнасцяў для нашых лёгкаатлетаў і іншых спартсменаў.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Лондан.*

| НЕАФІЦЫЙНЫ МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Краіна | Золата | Серабро | Бронза | Усяго |
| Кітай | 20 | 12 | 9 | 41 |
| ЗША | 18 | 9 | 10 | 37 |
| Паўднёвая Карэя | 8 | 2 | 5 | 15 |
| Францыя | 7 | 5 | 6 | 18 |
| Вялікабрытанія | 6 | 6 | 7 | 19 |
| Германія | 5 | 8 | 6 | 19 |
| Італія | 4 | 5 | 2 | 11 |
| КНДР | 4 | 0 | 1 | 5 |
| Казахстан | 4 | 0 | 0 | 4 |
| Расія | 3 | 9 | 8 | 20 |
| Новая Зеландыя | 3 | 0 | 2 | 5 |
| ПАР | 3 | 0 | 0 | 3 |
| Японія | 2 | 8 | 11 | 21 |
| Куба | 2 | 2 | 1 | 5 |
| Нідэрланды | 2 | 1 | 3 | 6 |
| Венгрыя | 2 | 1 | 2 | 5 |
| Украіна | 2 | 0 | 4 | 6 |
| Аўстралія | 1 | 8 | 4 | 13 |
| Румынія | 1 | 3 | 2 | 6 |
| Бразілія | 1 | 1 | 3 | 5 |
| **БЕЛАРУСЬ** | 1 | 1 | 2 | 4 |
| Славенія | 1 | 0 | 2 | 3 |
| Грузія | 1 | 0 | 0 | 1 |
| Літва | 1 | 0 | 0 | 1 |
| Венесуэла | 1 | 0 | 0 | 1 |
| Мексіка | 0 | 3 | 1 | 4 |
| Канада | 0 | 2 | 5 | 7 |
| Калумбія | 0 | 2 | 1 | 3 |
| Чэхія | 0 | 2 | 0 | 2 |
| Швецыя | 0 | 2 | 0 | 2 |
| Данія | 0 | 1 | 2 | 3 |
| Бельгія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| Інданезія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| Іспанія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| Індыя | 0 | 1 | 1 | 2 |
| Манголія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| Польшча | 0 | 1 | 1 | 2 |
| Егіпет | 0 | 1 | 0 | 1 |
| Тайвань | 0 | 1 | 0 | 1 |
| Тайланд | 0 | 1 | 0 | 1 |
| Харватыя | 0 | 1 | 0 | 1 |
| Славакія | 0 | 0 | 3 | 3 |
| Азербайджан | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Сінгапур | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Малдова | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Нарвегія | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Сербія | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Катар | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Грэцыя | 0 | 0 | 1 | 1 |
| Узбекістан | 0 | 0 | 1 | 1 |

Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ:

## «АДХІЛЕННЕ ЦІХАНА — ГЭТА РАСПЛАТА ЗА ПЕРАМОГУ Ў СПРАВЕ З ДОПІНГАМ НА АЛІМПІЯДЗЕ-2008»

Адхіленне Івана Ціхана ад удзелу ў Алімпійскіх гульнях у Лондане — гэта расплата за яго перамогу ў справе, звязанай з ужываннем допінгу на Алімпіядзе-2008 у Пекіне. Цвёрдую ўпэўненасць у гэтым у гутарцы з карэспандэнтам БелТА выказаў заслужаны майстар спорту Беларусі, сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Пекіне, прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы Вадзім Дзевятоўскі.

«Сама сітуацыя сведчыць, што ўсё было зроблена для таго, каб зняць Івана Ціхана са спаборніцтваў. Пасля Алімпіяды ў Пекіне, калі мы адваявалі сваё права на медалі ў Міжнародным судзе (Міжнародны арбітражны суд (CAS) у Лазане. — **Заўв. БелТА**), нам многія гаварылі, што мы зрабілі немагчымае. Такое, маўляў, не даруецца. Гэта адгалоскі той гісторыі», — лічыць Вадзім Дзевятоўскі.

Абурэнне выклікае той факт, што атлета, які прыклаў нямала сіл, каб узяць удзел у Гульнях, які патраціў на гэта сваё здароўе і атрымаў запрашэнне на Алімпіяду-2012, здымаюць на падставе проб, узятых яшчэ ў 2004 годзе. «За гэты час у спартсмена такога ўзроўню ўзяты сотні проб на розных спаборніцтвах, але ўзялі пробу, тэрмін захоўвання якой вось-вось міне — васьмігадовай даўнасці, калі складана сабраць якія-небудзь дакументы, ды і проста патрэбен час, каб успомніць, што было восем гадоў таму», — сказаў Вадзім Дзевятоўскі.

На яго думку, падобныя сітуацыі ўзнікаюць з-за таго, што ў спорце адсутнічае прэзумпцыя невінаватасці. «Барацьба з допінгам неабходная, але яна не павінна ўшчамляць правы спартсмена», — падкрэсліў суразмоўца. Свайму таварышу Вадзім Дзевятоўскі пажадаў не падаць духам. «Іван Ціхан — гэта сапраўды спартсмен і чалавек. Моцны і стойкі», — дадаў ён.

■ Прамая лінія

# ПАДАРВАНАЕ ЗДАРОЎЕ ЗАЛОЗ

**Наша эндакрынная сістэма рэгулюе дзейнасць унутраных органаў з дапамогай гармонаў, якія трапляюць у кроў. Гэты працэс магчымы дзякуючы залозам унутранай сакрэцыі (гіпаталамусу, гіпофізу, шчытападобнай залозе, наднырачнікам, палавым залозам, падстраўнікавай залозе). Пры парушэнні функцыі эндакрыннай сістэмы натуральны баланс абменных працэсаў збіваецца і развіваецца вялікая колькасць захворванняў. Больш за 60 працэнтаў ад гэтых хвароб належаць цукроваму дыябету.**

**Сёння ў свеце цукровы дыябет — адна з самых важных медыцынскіх і сацыяльных праблем (разам з сардэчна-сасудзістымі хваробамі, новаўтварэннямі і ВІЧ/СНІДам). Цукровы дыябет — гэта тэрмін, якія аб'ядноўвае групу захворванняў з хранічным павышэнным узроўню глікеміі (цукру) крыві. Праявы гэтага стану — вынік вострага або хранічнага дэфіцыту інсуліну, які ў сваю чаргу можа быць абсалютным ці адносным.**

**Глюкоза — асноўная крыніца энергіі ў арганізме. Інсулін — гармон, які спрыяе ўтылізацыі глюкозы. Калі інсуліну мала або ён дэфектны, то глюкоза не засвойваецца і арганізм пачынае шукаць іншыя шляхі атрымання энергіі. Разам з тым хранічная гіперглікемія аказвае таксічнае дзеянне на клеткі арганізма, з-за чаго развіваюцца так званыя позняя ўскладненні дыябету.**

**Раннія прыкметы развіцця дыябету 1 тыпу — смага, сухасць у роце, павышаны апетыт, пачашчанае мочавыдзяленне, асабліва ноччу. Гэта, як правіла, суправаджаецца стратай вагі, слабасцю, скурным свербам. Большасць такіх хворых схільныя да розных зацяжных інфекцыйных або запаленчых захворванняў.**

**Цукровы дыябет 2 тыпу звычайна развіваецца ў тых, каму за 40, часцей на фоне лішкаў вагі. У рэдкіх выпадках неўскладнены цукровы дыябет не праяўляецца яркай клінічнай карцінай і не дыягнастуецца шмат гадоў. Звычайна ж самі пацыенты кажуць пра ўмераную смагу, умерана пачашчанае мочавыдзяленне, павышаную стамляльнасць, запаленчыя скурныя хваробы, раны, якія доўга не загойваюцца, расплывістасць зроку, зніжэнне ці набор вагі.**

**Дыягназ «цукровы дыябет» ставіцца на падставе ўзроўню глікеміі ў крыві. У пацыентаў без сімптомаў дыягназ ніколі не ставіцца на падставе аднаразовага вызначэння глікеміі. У такіх сітуацыях праводзіцца паўторнае вызначэнне ўзроўню цукру, пры неабходнасці праводзіцца нагрузачны тэст з глюкозай.**

**А на вашы пытанні адказала загадчыца аддзялення эндакрынналогіі 1-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталля ЛІХАРАД.**

***— Івацэвічы, Марыя Макараўна. Падчас лячэння ў бальніцы выявілі аўтаімунны тырэідыд з невялікімі змяненнямі ў аналізе крыві. Тырэатропны гармон нязначна павышаны. Ёсць у мяне сардэчна-сасудзістая паталогія. Урач бальніцы прызначыў гарманальны прэпарат, а ўчастковы кажа, што можна пачакаць.***

— Я падтрымліваю ўчастковага ўрача — неабходна паўтарыць аналіз і не спяшацца з лекамі. Калі свабодны тыраксін будзе зніжаны, то, можа быць, і варта папрымаць прэпарат, а калі будзе ў норме, то можна і пачакаць. Праз паўгода можна прайсці паўторнае абследаванне. Ультрагук — не часцей за раз на год, паколькі вузлавой паталогіі ў вас няма.

***— Гомель, Антаніна Міхайлаўна. Сыну 32 гады. Другі год — гіпатырэоз, п'е тыраксін. Скардзіцца, што апошнім часам дрыжыць вока, шчыміць сэрца, адчувае слабасць. Тырэатропны гармон быў 190. Прапіў па 100 мг, стаў 4, а на гэтым тыдні — 32. І яму дабавілі дозу да 125 мг. Ці піць прэпарат у такой колькасці?***

— Без прыёму прэпарата вашаму сыну не абысціся. Аднак тут важная вага. У залежнасці ад вагі і разлічваецца патрэба ў гармонах. Другая ўмова, якую павінен улічваць пацыент, — час, калі прымаецца прэпарат. Паміж прыёмам прэпарату тыраксіну і прыёмам ежы павінна праходзіць не менш за 30 хвілін, каб прэпарат засвоіўся. У гэтым выпадку мэтагодна павышаць дозу і звярнуць увагу на тое, ці правільна адбываецца прыём прэпарата. У Гомельскім цэнтры радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека працуюць вельмі кваліфікаваныя спецыялісты. Таму вы без праблем можаце пракансультавацца ў іх.

***— Капыльскі раён, Ганна Рыгораўна. 71 год. 9 гадоў — цукровы дыябет 2 тыпу. Ногі баляць так, што немагчыма хадзіць. Інсулін калю чатыры разы, узровень цукру — то 3, то 13. Што трэба рабіць?***

— Мяркуючы па ўсім, вы сутыкнуліся з праявай дыябетычнай полінейрапатыі. Необходна звярнуцца да эндакрынолага па месцы жыхарства, адрэгуляваць цукар — гэты паказчык абавязкова павінен быць стабільным. Гэта самае важнае ў лячэнні дыябетычнай полінейрапатыі. Варта перагледзець дозу інсулінатэрапіі і прызначыць прэпараты, якія змяншаюць болевыя праявы. Іх на сёння шмат і ў кожным канкрэтным выпадку яны прызначаюцца індывідуальна.

***— Мінск, Наталля Адамаўна. Мужу 57 гадоў, цукровы дыябет вось ужо два гады. Цукар — ад 5,7 да 6,2. Таблеткі не прымае. Гатуем чарнічнік, дыябетан (чэшскі чай). Ці правільна мы робім, што не ўжываем таблеткі? Ці «шкодныя» ў яго лічбы цукру? Выпісваюць метфармін. Можа, ёсць і лепшыя прэпараты? У яго яшчэ дрэнны зрок, выдалены хрусталік, было некалькі аперацый на вачах...***

— На сёння цукар, калі аналіз зроблены нашча, добры. Лічбы «не шкодныя». Адзінае, што варта было б праверыць, — значэнні цукру яшчэ праз адну і дзве гадзіны пасля прыёму ежы. Паказчык павінен быць не вышэй за 8. Прэпарат метфармін для пачатковага дыябету — вельмі добры, прызначаецца для таго, каб павысіць адчувальнасць клетак да ўласнага інсуліну. На гэтым этапе, як мне падаецца, вашаму мужу ніякіх іншых прэпаратаў не трэба. Яму неабходна рэгулярна адсочваць узровень цукру, вытрымліваць дыету, перыядычна можна піць і травы, пра якія вы кажаце.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*(Працяг будзе.)*

95 ЗВЯЗДА

# Святкуем наш 95-гадовы юбілей разам!

**Увечары 6 жніўня (панядзелак) старэйшае і адзінае штодзённае беларускамоўнае выданне краіны — газета «Звязда» — разам са сталічным праспектам імя газеты «Звязда» ладзяць творчую вечарыну і сяброўскі турнір па міні-футболе. Супраць каманды газеты (прыгожыя дзяўчаты таксама гуляюць) будуць змагацца каманды Ліцэя №1, школ №165 і №181. Матчы пройдуць па алімпійскай сістэме: паўфінал і фінал (каманды, якія саступілі, адразу выбываюць са спаборніцтваў).**

Пасля гэтага выступяць і правядуць майстар-класы клубы лацінаамерыканскіх і сярэднявечных танцаў. Усе прысутныя спачатку акунуцца ў віхуру жарснага аргенцінскага танга, а пасля (спадзяёмся) змогуць ад душы паскакаць пад беларускую дуду.

Удзельнікаў свята чакаюць прызы і сувеніры ад «Звязды», і безумоўна, незабыўныя ўражанні і шанц стаць героямі фотарэпартажу ў юбілейным нумары нашай газеты.

Прыходзьце ўсе! Не пашкадуеце!

Чакаем а 6 гадзіне вечара па адрасе: г. Мінск, праспект «Звязды», 6/а (стадыён Ліцэя №1).

Больш падрабязная інфармацыя тут: **http://vk.com/event41271792.**

# АКЦЭНТЫ ТЫДНЯ

## з Вадзімам Гігіным

**У НАС.** Чалавеку ўласціва імкнуцца хутчэй забыць усё дрэннае, нібыта закідаць новымі ўражаннямі і пачуццямі. Але ў рэчаіснасці зрабіць гэта вельмі цяжка. Да выбуху ў мінскім метро 11 красавіка 2011 года мы будзем вяртацца яшчэ неаднойчы. На гэтым тыдні тая беларуская трагедыя зноў набыла міжнародны розгалас. Па тэлеканале Бі-Бі-Сі ў панядзелак быў паказаны «дакументальны» фільм па гэтай тэме. Ці то адбіваецца крызіс, ці якія іншыя акалічнасці, але канал, што ганарыцца сваёй дакументалістыкай, папросту пераказаў інтэрнэт-байкі. Маўляў, і не тыя ўзрывалі, і не так. Для большай падобнасці на праўду гэтыя «версіі» ўклалі ў вусны нейкіх загадкавых «беларускіх актывістаў».

Адказ прыйшоў імгненна і, як гавораць у народзе, адкуль не чакалі. Інтэрпал, сусветна вядомая і аўтарытэтная арганізацыя, выдала адпаведнае паведамленне, у якім поўнасцю падтрымала вынікі афіцыйнага расследавання. Міжнародныя эксперты яшчэ раз пералічылі неабвержныя доказы віны Канавалава і Кавалёва. Асабліва падкрэсліваецца, што адбіткі пальцаў Канавалава захоўваліся ў базе Інтэрпала з 2008 года, з часу першага выбуху ў Мінску. «У дадатак беларускія ўлады сабралі і прааналізавалі іншыя сведчанні, уключаючы рахункі за кватэру, тэлефанаванні, адзенне, што насілі, і матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца для таго, каб зрабіць бомбу, а таксама апыталі сотні сведкаў», — заявіў генеральны сакратар Інтэрпола Роналд Нобл. Было распаўсюджана таксама відэа, знятае высакаякаснай камерай, на якім добра бачна, што чалавек, які ідзе ў метро з вялікай сумкай, а потым выходзіць на вуліцу, гэта адна і тая ж асоба — Дзмітрый Канавалаў.

Пасля заявы Інтэрпола наўрад ці ў кагосьці з незаангажаваных экспертаў і журналістаў, простых грамадзян могуць застацца сумненні ў тым, хто падрыхтаваў выбух у метро.

Дарэчы, гэты выпадак вельмі паказальны. Заказны фільм, зняты ў стылі «выкрывання апошняй дыктатуры», наткнуўся на адмысловы адказ спецыялістаў, прафесіяналаў. Няводная, нават самая мудрагелістая байка не вытрымлівае канкурэнцыі з праўдай, з фактамі.

**ВАКОЛ НАС.** У ЗША ў самую гарачую стадыю ўступае выбарчая гонка за прэзідэнцкае крэсла. Вядома, што дэмакраты падтрымаюць дзейнага кіраўніка дзяржавы Барака Абаму. Рэспубліканцы вызначыліся са сваім прэтэндэнтам. Ім стаў 65-гадовы Міт Ромні, які на гэтым тыдні нарабіў шмат шуму.

Справа ў тым, што амерыканскія палітыкі мясцовага ўзроўню традыцыйна мала займаюцца міжнароднымі справамі. Гэта з'яўляецца ў іх нават падставай для гонару: маўляў, мяне не турбуе Еўропа ці Камбоджа, а толькі вашы праблемы, мае шаноўныя выбаршчыкі. Не выключэнне і Ромні, які ў сваёй кар'еры спыніўся на пасадзе губернатара штата Масачусетс. Таму звычайна прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду павінен здаць своеасаблівыя іспыты на прафпрыдатнасць у справах знешняй палітыкі. Камандa Ромні выбрала для гэтага турнэ ў Ізраіль і Польшчу. З візітам у нашу суседку ўсё зразумела — ён насіў адкрыта антырасійскі характар. Лех Валенса, які і запрасіў амерыканскага госця, не хавае, што вельмі незадаволены палітыкай «перазагрузкі», якую праводзіць сённяшняя адміністрацыя Белага дома ў дачыненні да Расіі. А вось у Ізраілі адбылася сенсацыя.

Рэспубліканскі кандыдат публічна заявіў, што не толькі падтрымлівае ў блізкаўсходнім канфлікце Ізраіль, але і выступае за тое, каб прызнаць сталіцай гэтай дзяржавы Іерусалім, куды трэба перанесці пасольства ЗША. Гэта выклікала вельмі негатыўную рэакцыю з арабскага боку і крытыку ў міжнароднай прэсе. Справа ў тым, што пытанне статусу Іерусаліма — адно з самых складаных. Ізраіль абвяшчае яго «вечнай і непадзельнай сталіцай», Палесціна лічыць Усходні Іерусалім сваёй будучай сталіцай. Зараз практычна ўсе замежныя пасольствы ў Ізраілі знаходзяцца ў Тэль-Авіве. Праўда, Кангрэс ЗША яшчэ ў 1995 годзе вырашыў перанесці сваё дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Іерусалім, але гэтае рашэнне ўпарта не выконваецца амерыканскімі адміністрацыямі.

Навошта Ромні быў патрэбен гэты скандал? Выбарчая кампанія ў ЗША складаецца з барацьбы за галасы асобных катэгорый грамадзян. У этнічным плане існыe тры вялікія электаральна значныя групы: лацінаамерыканская (самая вялікая, але не вельмі ўплывовая), афра-амерыканская (вялікая і ўплывовая) і яўрэйская (параўнальна невялікая, але самая ўплывовая). У першых дзвюх рэспубліканцы традыцыйна саступаюць дэмакратам. Таму Ромні і спатрэбілася падтрымка яўрэйскай абшчыны, і праізраільская рыторыка тут — жалезабетонны аргумент.

А скандал... Ну дык што ж?! Калісьці Джордж Буш-малодшы не здолеў здаць кантрольную па знешняй палітыцы, якую яму прапанаваў адзін з тэлеканалаў. І нічога — адбыў два тэрміны прэзідэнцтва. Галасы выбаршчыкаў куды больш важныя.

**З МІНУЛАГА.** 31 ліпеня споўнілася 210 гадоў з дня нараджэння Ігната Дамейкі, вядомага геолага, географа і этнолага. Я зараз не збіраюся распавядаць пра значэнне яго прац і падрабязнасці жыццёвага шляху — пра гэта напісана і так нямала. Узгаданы юбілей — добрая падстава паразважаць, чаму ў свеце амаль не ведаюць, што Дамейка паходзіць з Беларусі. Для большасці ён паляк, які стаў нацыянальным героем Чылі.

Ігнат (дакладней, Ігнацы) Дамейка належаў да рамантычнага пакалення палоналіцвінскай шляхты. Так, яго карані на Навагрудчыне, паходзіць ён з мясцовых землеўладальнікаў. Але паланізацыя ў XVIII—XIX стагоддзях дасягнула такіх памераў, што наўрад ці малады Дамейка ўсведамляў сябе кімсьці іншым, як не палякам. Таму і змагаўся за аднаўленне незалежнасці сваёй Радзімы — Рэчы Паспалітай — і Канстытуцыю 3 мая 1791 года. А па гэтым дакументе Рэч Паспалітая — польская дзяржава, і ніякай культурнай, нацыянальнай прасторы для беларусаў там быць не магло. За свае ідэалы Дамейка змагаўся шчыра, палымяна, спачатку ў тайных таварыствах філаматаў і «прамяністых» у Віленскім універсітэце, а потым у час паўстання 1830-31 г

# У ПРАДЧУВАННІ СВЯТА

## Да Дня беларускага пісьменства засталося 29 дзён

**Падрыхтоўка да яго здзіўляе, радуе і непакоіць глыбачан. Мяркуйце самі. Нядаўна будаўнікі адкапалі каменны крыж. А крыху раней, каля Траецкага касцёла, знайшлі звон, на пацямнелай паверхні якога выбіты дата — 1882 год і надпіс на польскай мове: «Ліў А. Звакінскі ў Варшаве». Плануецца, што 2 верасня да званіцы храма далучыцца і яго звонкі голас.**

Сувенірную прадукцыю да Дня беларускага пісьменства ўжо зараз можна набыць у крамах Глыбокага.

Ціхі азёрны гарадок у гэтыя дні нагадвае вялізную будаўнічую пляцоўку. Куды ні кінь — стрэлы аўтакранаў, экскаватары, самазвалы, бульдозеры, катлаваны, траншэі, штабелі цэглы, пліткі, труб... Адусюль нясецца стук адбойных малаткоў, піск электрапіл, з рыштаванняў сыплюцца іскры газазваркі. Глыбокае абнаўляецца, прыхарошваецца. Не пазнаць вуліцы Леніна, што злучае цэнтральную плошчу з плошчай 17 верасня, на якім узвышаюцца велічныя храмы, архітэктурныя помнікі XXVII стагоддзя — кафедральны сабор Раства Прасвятой Багародзіцы і касцёл Святой Троіцы. Менавіта сюды прыйдзе шлях рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга, што, па сутнасці, з'яўляецца неад'емнай часткай Дня беларускага пісьменства. Ды і сама плошча вяртае ранейшае аблічча: цяпер яна выглядае такой, якой была да Вялікай Айчыннай вайны. Заканчваецца рэканструкцыя сабора, Беразвецкага жаночага кляштара ў гонар Архістратыга Архангела Міхаіла, іншых помнікаў гісторыі і культуры. Заўважым, у Глыбоцкім раёне зарэгістравана амаль 40 рэлігійных суполак, у тым ліку тры пратэстанцкія, па адной суполцы стараверaў, мусульман і Сведкаў Іеговы.

Месца правядзення Свята беларускага пісьменства выбрана невыпадкова, не па «разнарадцы». Шчыра кажучы, Глыбокае заслугоўвае самай пільнай увагі. Тут жывуць на дзіва прыгожыя, працавітыя, таленавітыя, ветлівыя людзі, з іх самабытнай культурай і векавымі традыцыямі. Зямля дала свету шмат выбітных асоб. Сярод іх — адмысловыя працаўнікі, навукоўцы, педагогі, народныя майстры, вядомыя дзяржаўныя і палітычныя дзеячы, кваліфікаваныя спецыялісты ўсіх сфер народнай гаспадаркі. Іх веды, розум, самаадданая праца ўзбагацілі не толькі азёрны край, але і ўсю Бацькаўшчыну, імя якой Беларусь.

Успомнім некаторых з іх — Вацлаў Ластоўскі, Ігнат Буйніцкі, Паўліна Мядзёлка, Клаўдзій Дуж-Душэўскі, Язэп Драздовіч, Павел Сухой, Элізэр Бен-Ігуда...

Паэтычна-песенная, маляўнічая Глыбоччына яшчэ і край слынных пісьменнікаў, якія нарадзіліся, выраслі і працавалі тут і якія сваёй творчасцю ўнеслі важкі ўклад у нацыянальную беларускую і сусветную літаратуру. Тадэвуш Даленга-Мастовіч у даваенны час у Польшчы выдаў 16 раманаў і аповесцяў, восем з якіх экранізаваныя. Найбольш папулярнымі лічацца «Знахар», «Іх дзіця», «Тры сястры», «Прафесар Вільчур». Рускі пісьменнік Лявонцій Ракаўскі, аўтар аповесці «Канстанцін Заслонаў», пераклаў «Паўлінку» Я. Купалы, драму Я. Коласа «Вайна вайне», раман І. Мележа «Мінскі напрамак», творы П. Кавалёва, М. Лынькова і іншых класікаў беларускай літаратуры.

Мікола Мінскі, Ян Пачопка, Алесь Дубровіч і іншыя пакінулі нам цікавыя, запамінальныя творы.

У пасляваенны час на Глыбоччыне вырасла, узмужнела, набралася сіл для высокага палёту новае пакаленне творцаў — Уладзімір Сауліч, Алесь Жыгуноў, Тамара Чабан, Марыя Баравік, Ірына Жарнасек... Іх праца — яскравае сведчанне таго, што паэтычная крыніца, якая аднойчы забурліла магутным струменем на гэтай прыгожай зямлі, невычэрпная, яна сілкуе маладыя літаратурныя парасткі.

— Роднае беларускае слова тут ніколі не было ў заняпадзе, — сцвярджае **намеснік старшыні райвыканкама Галіна УНУКОВІЧ**. — Яно гучыць не толькі ў вёсках, але і на гарадскіх вуліцах, у дзяржаўных установах. Ім свабодна карыстаюцца ўсе нашы супрацоўнікі, пачынаючы са старшыні райвыканкама Алега Віктаравіча Мохарта. Раён наш — цікавы. У ім яшчэ не перавяліся майстрыхі, якія ўмеюць шыць народныя касцюмы, ткаць каляровыя ручнікі, пакрывалы, паясы. У нас ёсць умельцы, для якіх зрабіць дубовы кубелец, ліпавую бочачку, металічны абажур — звычайная справа.

Так, кемлівых, працавітых людзей можна сустрэць на кожным прадпрыемстве, ва ўстановах. Бадай, ніводзін раён Беларусі не можа пахваліцца такім яркім сузор'ем Герояў. Уявіце сабе: тут нарадзіліся, жылі, працавалі адзін двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, адзін Герой Савецкага Саюза і восем Герояў Сацыялістычнай Працы.

Да Свята беларускага пісьменства рыхтуюцца літаральна ўсе глыбачане, каб 2 верасня, хоць на дзень па праве адчуць сябе жыхарамі «сталіцы». Яны добраўпарадкоўваюць вуліцы, разбіваюць кветнікі, фарбуюць дамы і агароджы... Вялікую дапамогу аказваюць раёну амаль усе міністэрствы і ведамствы рэспублікі, многія бізнэсмены, прыватныя прадпрыемствы.

Бадай, як ніколі, рупліва рыхтуюцца да Дня беларускага пісьменства самадзейныя артысты — у раёне 19 народных і ўзорных калектываў. Паслухаць матчыну песню ў іх выкананні — тое самае, што напіцца вады з чыстай крыніцы.

**Уладзімір БАЦКАЛЕВІЧ.**
**Фота Марыі БЕГУНКОВАЙ.**
*г. Глыбокае.*

Хутка скончыцца рэканструкцыя на цэнтральнай вуліцы горада.

# ШКОЛЬНІК З ГЛЫБОКАГА СТВАРЫЎ САЙТ ДА ДНЯ ПІСЬМЕНСТВА

**Сямікласнік Глыбоцкай раённай гімназіі Уладзіслаў Лаўцэвіч пры дапамозе сваёй настаўніцы па інфарматыцы Лідзіі Анатольеўны Раманчук стварыў інтэрнэт-сайт, прысвечаны сёлетняму Дню беларускага пісьменства. Нагадаем, што свята пройдзе 2 верасня ў Глыбокім. І чарговая сталіца Дня беларускага пісьменства атрымала нечаканы падарунак ад свайго юнага жыхара. Сайт http://belpismennost12.ucoz.ru карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод наведвальнікаў «сусветнага павуціння».**

Уладзіслаў Лаўцэвіч.

Акрамя таго, на сайце ёсць інфармацыя аб гарадах, якія ўжо былі сталіцамі свята. І, безумоўна, жыхарам Віцебскай вобласці (і, у прыватнасці, Глыбокага) таксама вельмі прыемна, што ўпершыню Дзень пісьменства правялі ў старажытным Полацку — у 1994 годзе. Дарэчы, там жа і ў 2003-м... І Орша, Паставы прымалі свята. Цяпер святочная эстафета ў паўночнай вобласці Беларусі перададзена Глыбокаму.

— Так, вы не памыліцеся, калі будзеце называць хлопчыка юным вундэркіндам. Уладзіслаў і падчас канікулаў прыходзіць у гімназію, каб па тры гадзіны і больш на дзень займацца інфарматыкай. Са мной займаецца, пачынаючы з чацвёртага класа, калі ўпершыню прыйшоў на пазашкольны занятак, — гаворыць Лідзія Раманчук, настаўнік інфарматыкі Глыбоцкай раённай гімназіі. — Хлопчык вельмі адораны. Ён — пераможца розных конкурсаў і алімпіяд па праграмаванні і інфарматыцы. У прыватнасці, летась у Наваполацку Уладзіслаў стаў прызёрам рэспубліканскага конкурсу, які праводзіў «Парк высокіх тэхналогій». Стаў і пераможцам абласнога дыстанцыйнага конкурсу праектаў «Я пазнаю свет»...

— На момант нашай сустрэчы на сайце зарэгістравана больш за тысячу праглядаў. Мне падабаецца чытаць каментарыі аб сайце ў «міні-чаце», — расказвае Уладзіслаў Лаўцэвіч, адміністратар сайта, вучань 7 класа Глыбоцкай раённай гімназіі. — Вось, напрыклад: «Мне вельмі падабаецца гэты сайт», «Вельмі добры сайт», «Выдатны сайт!!!».

На сайце расказваецца аб з'яўленні пісьменства, аб паходжанні беларускай мовы, аб вядомых на ўвесь свет беларускіх асветніках. Ёсць інфармацыя аб мерапрыемствах, якія ў гімназіі прымеркаваны да свята пісьменства, расказваецца аб паэтах Глыбоччыны. Гэтую і іншую інфармацыю Улад Лаўцэвіч назапашваў прыкладна год. Акрамя таго, на сайце размешчана больш за 160 фотаздымкаў (у 20 альбомах) з выявамі храмаў, вуліц раённага цэнтра, фасадаў прадпрыемстваў і аб'ектаў грамадскага прызначэння, а таксама фота з выявамі былых сталіц Дня пісьменства. Ёсць фота і сувенірнай прадукцыі да Дня пісьменства.

Сайт пакуль што толькі рускамоўны. Але, паводле слоў Лідзіі Раманчук, падчас работы прышкольнага летніка дзеці пры дапамозе настаўнікаў будуць ствараць французскую і англамоўную версіі. І, безумоўна, абавязкова будзе і беларускамоўны варыянт. Уладзіславу Лаўцэвічу ў рабоце над сайтам вельмі дапамагае і яго мама, якая працуе загадчыцай вучэбнай часці ў сельскай школе. Што тычыцца мецэнатаў, пакуль іх няма. А было б добра, каб нехта з прадстаўнікоў бізнэсу (дарэчы, вельмі развітага ў Глыбокім) падтрымаў Уладзіслава.

Хто ведае: можа праз некалькі гадоў менавіта Улад стане адным з самых перспектыўных маладых беларускіх навукоўцаў. Таму шчыра хочацца пажадаць яму натхнення, цярплівасці і добрых настаўнікаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ФУТБОЛ, ЯКІ НАМ НЕАБХОДНЫ

**У першым матчы 3 кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы «Гомель» дома з мінімальным лікам саступіў «Ліверпулю» — 0:1.**

Футбалісты падарылі Гомелю сапраўднае спартыўнае свята.

Яшчэ нядаўна падобную навіну ўспрымалі б спакойна, без вялікага шкадавання. На жаль, не так часта айчынныя клубы ўдала гуляюць з агульнапрызнанымі грандамі. Але не ў гэты раз! Балельшчыкі на свае вочы ўбачылі, як «Гомель» на роўных дзейнічае з адным з лідараў брытанскага футбола. І, ведаеце, гэта не ўтопія, а сапраўдная рэчаіснасць. Падапечныя Алега Кубарава прадэманстравалі той футбол, якога нам не хапае. Таму не дзіўна, што паражэнне некаторыя футбалісты ўспрынялі, як маленькую драму...

### «Куды едзем? «Гомель» глядзець?»

Прызнацца, вынік лёсавання не абяцаў камандзе Кубарава лёгкае жыццё. «Ліверпуль». Назва вядомай каманды гучала для песімістаў, як прыгавор, які вынесены загадзя і канчаткова. Зрэшты, у Беларусь прыляцеў сапраўдны гігант, 18-разовы чэмпіён падзімы футбола — Англіі. А таму інтарэс быў павышаны, а ахвотных убачыць у працы Джэрарда і кампанію — процьма.

— Куды мы едзем? «Гомель» глядзець? — услых разважалі сталічныя хлопцы, суседзі па ранішнім цягніку «Гродна — Гомель». — Дык мы яго і ў Мінску ўбачым, і ў Барысаве, і ў Салігорску. А вось «Ліверпуль»... І сапраўды, брытанцы сталі менавіта тым эксклюзівам, дзеля якога на поўдзень Беларусі з'язджаліся балельшчыкі з усіх куткоў радзімы і бліжэйшага замежжа. Каля парк-атэля «Замкавы», дзе пасяліліся англічане, мы сустрэлі хлопца, які загадзя, за 17 гадзін да сустрэчы прыехаў у Гомель, а ў 10 гадзін раніцы ўжо дзяжурыў каля гасцініцы.

— Мне хочацца ўбачыць усю каманду, павітаць іх, — кажа Дзмітрый, які ўжо 12 гадоў усім сэрцам «хварэе» за «Ліверпуль». — Як ставяцца да нашага захаплення мясцовыя жыхары? Збольшага нармальна, але былі і тыя, хто прасіў схаваць майкі.

Каля стадыёна таксама шмат рускамоўных заўзятараў у чырвоных футболках. Студэнтка Аксана за брытанцаў хварэе ўжо чацвёрты год, нягледзячы на тое, што сама нарадзілася ў... Гомелі. А вось Сяргей, інжынер з Санкт-Пецярбурга, падтрымлівае «Лівер» ужо 31 год і добра памятае не толькі выдатнага галкіпера Бруса Грабелара, але і яго надзейнага папярэдніка Рэя Клеменса! Дарэчы, карэнных брытанцаў у Беларусь прыехала не так шмат. Кажуць, проста не паспелі зрабіць візы. Аднак былі сярод іх і адметныя тыпажы. Напрыклад, гаваркі Домэні, які прыехаў у Гомель на аўто з Мінска. Сам працуе ў горадзе Абу-Дабі (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты), але прыляцеў у Беларусь праз Стамбул, каб падтрымаць любімую каманду. Ён нічога не ведае пра наш футбол, лічыць Аляксандра Глеба не вельмі добрым футбалістам, але адзначыў, што Беларусь вельмі прыгожая краіна. Вось і паспрабуй зразумець англійскую логіку. А яшчэ жадалі «Гомелю» паражэння ў гульні з македонскай «Рэновай», каб не ляцець у невядомую Усходнюю Еўропу.

Футбольнае свята ў горадзе над Сожам супала з яшчэ адной традыцыйнай і эпатажнай падзеяй — Днём паветрана-дэсантных войск. Мясцовы гарвыканкам вокамгненна адгукнуўся на цікавае супадзенне і абвясціў чацвер днём цвярозасці. Толькі гэта не скарэктавала планы хлопцаў у цяльняжках. Дуэт былых дэсантнікаў нават спрабаваў прайсці ў гасцініцу па аўтографы футбалістаў «Ліверпуля». «Братка, нам толькі два подпісы ўзяць!», — з імпэтам працягваў фотаздымкі ахоўніку ўжо «стомлены» мужчына. Але справа была марнай. «Сек'юрыці» быў строгі і сантыментаў дэсантнікаў не разумеў. У выніку хлопцы пахмурнелі і пайшлі ні з чым. Затое гучнае «За ВДВ!» чулася з розных бакоў яшчэ доўга, а нехта з бравых дэсантнікаў нават прыйшоў на футбол і разам з усімі падтрымліваў беларусаў. Што не кажы, вось ён — патрыятызм.

### Фартуна пайшла ў адпачынак

Акурат у 21.00 стадыён «Цэнтральны» літаральна выбухнуў, загучаў тысячагалосым хорам. Паядынак пачаўся нечакана: гаспадары прыбралі ініцыятыву і цалкам дамінавалі ў першай палове матча. Забіваць «Ліверпулю» «зялёна-белыя» маглі і ў другой палове, але гасцей ад фіяска выратавала штанга. Напэўна, Фартуна ад «Гомеля» проста пайшла ў адпачынак. Гамяльчане ў шматлікіх момантах сапраўды перайгравалі вядомага апанента, але сцэнарый у матча быў зусім іншым. Госці, якія нядаўна выйшлі з адпачынку, адным моцным, прыгожым, трапным ударам даказалі, што перамогі ў такія моманты можна дасягнуць і на класе. Напэўна, у адпаведных сітуацыях «Гомелю» яго і не хапала. Затое ў дзеяннях беларусаў была сапраўдная шчырасць, жаданне гуляць у добры атакуючы футбол з тым, каго загадзя лічылі фаварытам. І ў каманды гэта сапраўды атрымалася. Толькі на выніковых лічбах гэта не адлюстравалася.

— Шкада, што мы саступілі, — адзначыў пасля цяжкага матча ў запоўненым прэс-цэнтры стомлены Алег Кубараў, галоўны трэнер ФК «Гомель». — Мы не заслугоўвалі паражэння.

Але падобнае паражэнне часам «смачнейшае» за самую марудную перамогу. Балельшчык гульню гаспадароў ацаніў працяглай авацыяй. А гэта — сапраўдная мерка для сапраўднага футбола.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара і Настассі ХРАЛОВІЧ.**
*г. Гомель.*

У барацьбе з беларускімі абаронцамі Стывену Джэрарду (№ 8) часам было вельмі няпроста.

# ДРУГОЙ СВЕЖАСЦІ НЕ БЫВАЕ

**За рэалізацыю пратэрмінаваных прадуктаў прадпрыемствы гандлю Магілёва паабяцалі караць прыпыненнем ліцэнзіі. Сёлета крамы ў абласным цэнтры, паводле праверак, дапусцілі больш за сотню выпадкаў продажу прадуктаў, якія сапсаваліся з-за парушэння умоў захоўвання ці з пратэрмінаваным тэрмінам прыгоднасці.**

Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Станіслаў Барадаўка парэкамендаваў больш жорстка падыходзіць да фактаў разгляду парушэння правілаў гандлю. У тым ліку звязаных з парушэннем тэрмінаў і тэмпературных рэжымаў захоўвання, што вельмі актуальна цяпер, у летнюю спёку, а таксама з культурай абслугоўвання, што на парадку дня заўсёды.

**Алена КАЗЛОВА.**

■ Адукацыя

## ЗАМЕЖНАЯ МОВА: ведаеш — не ведаеш, а здаваць давядзецца!

**У 2013 годзе ў пераліку абавязковых выпускных экзаменаў за курс сярэдняй школы з'явіцца яшчэ адна абавязковая дысцыпліна — замежная мова. Згодна з пастановай Міністэрства адукацыі, выпускнікі 2013 года ў абавязковым парадку будуць здаваць пісьмовы экзамен па матэматыцы, пісьмовы экзамен па беларускай ці рускай мове на выбар і экзамен па замежнай мове ў вуснай форме.**

І хоць намер увесці на выхадзе са школы яшчэ адзін дадатковы экзамен быў абвешчаны даўно, тым не менш для вучняў і іх бацькоў па-ранейшаму застаецца невядомым яго фармат.

У Міністэрстве адукацыі сцвярджаюць, што падыходы ў школах да вывучэння замежных моў апошнім часам карэнным чынам змяніліся: дзейная сёння сістэма арыентавана, у першую чаргу, на авалоданне камунікатыўнай кампетэнцыяй, каб кожны выпускнік мог свабодна на замежнай мове размаўляць, а не толькі чытаць тэксты і разбірацца ў граматыцы. З гэтай мэтай было прынята рашэнне падзяліць вялікія класы на тры групы: каб у настаўніка было больш часу для стасункаў з кожным вучнем.

Апрабацыя выпускнога экзамену па замежнай мове ўжо прайшла. А ў наступным годзе праэкзаменуюць гатоўнасць свабодна размаўляць на замежнай мове ўжо ва ўсіх выпускнікоў 11-х класаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## МАРКЕТЫНГ ПА-САВЕЦКУ

Цяпер у газетах, на радыё, тэлебачанні сустракаецца столькі чужых мудрагелістых слоў, што галава ідзе кругам. А падумаеш, унікнеш у сэнс, дык усё ж там проста, бо менеджмент — тое ж, што кіраванне, кастынг — адбор, маркетынг...

У савецкія часы загадчыкі сельмагаў гэтага слова не чулі, а вось тавары збываць умелі — жыццё вучыла.

Я да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС жыў на Палессі. Вёска там была вялікая. Адпаведна і сельмаг — як цяпер супермаркет (хоць і ў мініяцюры), бо гандлявалі там — ну ўсім. Большасць тавараў — прадуктовых, прамысловых — як ім і належыць, знаходзілася ў людзей на вачах, пра нейкія (кшталту мяхоў з камбікармамі) паведамлялася ў абвестках, пра асобныя — (не без таго) ведалі хіба адзінкі... І яны ж іх куплялі.

Але зараз не пра гэта, а пра яго вялікасць маркетынг.

Адзін з прыёмаў — гандаль з нагрузкай. Гэта калі да нейкага дэфіцытнага тавару дабаўляюць нехадавы (кшталту белых хатніх тапачак альбо бляшанкі заляжалых кансерваў). Галоўнае тут: не хочаш — не бяры. Нехта іншы возьме ды яшчэ і падзякуе — у перыяд агульнага дэфіцыту гэты прыём меў вельмі шырокае распаўсюджанне. Хоць па прыродзе сваёй ён быў валюнтарысцкім, можна сказаць, што нават гвалтоўным.

Таму наша кума, якая працавала загадчыцай у вясковым «супермаркеце», вынайшла свой. Ну, вось напрыклад. Заляжаўся на паліцах рулон тканіны. Трэба нешта рабіць. Яна ціха, без сведак, здымае яго, заносіць у падсобнае памяшканне і выклікае сяброўку. Тая сярод белага дня прыходзіць у краму. І выходзіць — хаваючы штось пад пахай. Прычым — у час найбольшага наплыву пакупніц.

Яны, вядома ж, з пытаннямі: «Клава, а што ты купіла?», «А што ты нясеш?».

Яна ў адказ і адной, і другой: «Ат, нічога такога...». А ўжо трэцяй-чацвёртай, крадком, каб ніхто не бачыў, паказвае адрэз матэрыі, кажа, што гэта, маўляў, ёй загадчыца сельмага па-сяброўску прадала. На халат...

Жанчыны ёсць жанчыны. Ім таксама хацелася нечага такога, купленага «па-сяброўску», па блаце. Таму яны, хто з чым мог, падыходзілі да кумы, прасілі прадаць дэфіцыту — на халат, на сукенку, сабе, дзіцяці...

Трэба сказаць, што кума наша трохі артысткай была: бажылася спярша, што тканіны гэткай болей няма: «рэштачкі ў рулоне, нейкія два-тры метрыкі, для сябе пакідала». Потым — «ішла насустрач»: «Ну хіба для вас... Можа, адмераю... Толькі ж ні слова і нікому...»

Такім вось чынам у падсобным памяшканні крамы з вялікага рулона адмотваліся метры, ціха і вельмі хутка прадаваліся адрэзы...

У тым ліку — і той, які неўпрыкмет вяртала ў краму сяброўка нашай кумы — Клава.

**Валерый Мікалаевіч Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

## ВЕК ЖЫВІ...

Выпадак гэты не з тых, што называюць значнымі, не з тых, што называюць вясёлымі, і адбыўся ён даўным-даўно, але ж помню яго ўсё жыццё. І іншым раскажу: раптам спатрэбіцца.

Я тады была маладая — нарадзіла другога сыночка.

І ніякіх табе грашовых дапамог з боку дзяржавы, ніякіх дзіцячых сумесяў і памперсаў, ніякіх ясляў-садкоў... Адзінае — якраз у той час мы, парадзіхі, атрымалі нечувану льготу: аж да года (!) «сядзець» у так званым дэкрэтным водпуску, гадаваць сваіх немаўлят. Праўда, за ўласны кошт, без утрымання...

А сям'я ж — чатыры чалавекі, дапамогі з боку ніякай, на адну зарплату жылі.

Карацей, каб неяк выкруціцца, каб лягчэй пражыць, а то і «разбагацеці», пасадзіла я на яйкі... індычку. Ведала: далікатная гэта птушка, ды і расце даўжэй, але ж калі вырасце...

Хацелася мне займець «бясплатнае» мяса, да таго ж дыетычнае...

І вось «радзіны» ў нас. Усё, як кажуць цяпер, пад кантролем: назіраю за працэсам вылуплівання, забіраю малечу з-пад індычкі (яна ў гэты час вельмі неспакойная і можа патаптаць), нашу на кухню — у скрынку з пер'ем...

Чую, старэйшы сынок да мяне бяжыць, крычыць:

— Мама, там на зямлі птушанятка — ластавачка маленькая! Мабыць, з гняздзечка выпала?

Кідаю ўсё, падбягаю з малым пад акно, гляджу — і сапраўды, жаўтароцік там. Нават скакаць яшчэ не ўмее. А ўжо, бач ты, думаю, цікавіцца, што там, за «сценамі» дома, хоча лятаць, не ведае па дурноце, што тут кот можа з'есці...

Карацей, вырашылі з сынам, што птушку трэба ўратаваць: прыцягнулі драбіну, я залезла па ёй да гнязда, пасадзіла птушанятка на месца. З палёгкай уздыхнулі...

Праз нейкі час бачым — што за ліха? — яно зноўку на зямлі.

Яшчэ раз мы з сынам паднялі яго, яшчэ раз вярнулі ў сямейку...

Калі ж малое звалілася ў трэці раз, падумалі, што птушачка, мусіць, з нейкага іншага гнязда (раз у гэтым яе не прымаюць). А таму (ну што ты будзеш рабіць?) панеслі яе да сябе на кухню — у скрынку, дзе было ўжо некалькі індычанят...

Потым і сюды ж я прыносіла новых. Вось ужо і апошняе.

Кладучы яго ў пух, з жалем убачыла, што наш падкідыш, наша маленькая ластавачка ўжо... нежывая. Так шкада яе было!..

Ды яшчэ больш — сваіх індычанят, бо іх (прычым усіх да аднаго і хутка) напаткаў... такі ж самы трагічны лёс.

Так што мы з сынам суцяшалі сябе хіба тым, што ластаўка, выкінуўшы з гняздзечка хворае дзіця, ураталала астатнюю сямейку.

...Што ж, у дзікай прыроды свае законы. Часам вельмі жорсткія, але ж інакш, мусіць, нельга.

**Ірына Міхайлаўна Рудкоўская,**
*в. Хатынічы, Ганцавіцкі раён.*

## Я — БЕЛАРУС

Не ведаю, можа, памыляюся, але ж падаецца, што ўсё наша жыццё складаецца з сустрэч: недзе — знакавых, недзе чаканых... І нечаканых.

У 80-я гады мінулага стагоддзя першым сакратаром райкама партыі працаваў у нас камуніст з досыць рэдкім прозвішчам — Украінец. Чым запомніўся? Сваёй строгасцю, сваёй патрабавальнасцю, сваёй упэўненасцю ў тым, што калі жывеш у вёсцы, то проста павінен быць гаспадаром, быць будаўніком. Гэта значыць, сачыць за парадкам, усё ўмець, своечасова рамантаваць, загадзя рыхтавацца да зімы, да сяўбы, да жніва... Прычым гэта ў яго не на словах было: звычку меў першы сакратар «шастаць» па раёне, па самых далёкіх фермах і палях — правяраць, як сеюць, як жнуць, як даглядаюць жывёлу.

Дык вось аднойчы пад абед прыязджае ён на ферму (мой знаёмец там даглядчыкам працаваў). Заходзіць у памяшканне, ідзе паміж радоў (на адкорме там каля 200 ладных цялят стаяла), бярэ пасму сена і падносіць да пысы аднаму з бычкоў. Той, зразумела, есць, а астатнія, гэта ўгледзеўшы, як падымуць роў — хоць ты з фермы ўцякай.

Ці не на шум даглядчык з'яўляецца. Візіцёр да яго:

— Лайдак! Ты чаму скаціну не корміш? Раве галодная...

— Гэта я «не кармлю»?.. Ды хто табе сказаў?! — абураецца жывёлавод (трэба сказаць, што першага сакратара ён дагэтуль у вочы не бачыў).

— Чаго ж яна раве, калі не галодная?

— А хто ты такі, каб пытацца? З'явіўся, не запыліўся... Староннім тут наогул не месца!

— Гэта я староннi? — пакрыўдзіўся сакратар. — А ты ведаеш, хто я? Я — Украінец!

— Ну і што, што ты ўкраінец? — адказаў даглядчык. — А я — беларус!

Прыезджы тут памаўчаў, а потым, сцішыўшы голас, кажа:

— Ну, калі табе маё прозвішча ні аб чым не гаворыць, дык тады ведай, што я — першы сакратар райкама партыі. А вось ты... Ты, брат, не, не беларус. Бо беларус сам галодным застаўся б, а жывёлу пакарміў бы.

— Прабачце, — адступіўся даглядчык, — не разгледзеў вас, таварыш Украінец, не пазнаў. — А скаціну я зараз пакармлю. І хуценька. Пара якраз.

Схапіўшы вілы, ён пачаў раскладваць сена па кармушках. І з той пары на ўсё жыццё запомніў, што беларус — гэта не пусты гук, не запіс у пашпарце. Гэта — нешта іншае... Што абавязвае чалавека быць чалавекам.

**М.П. Багданаў,**
*в. Новы Пагост, Мёрскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Газета — чытач

# ПЯЦЬ ГАДОЎ І ЧАТЫРЫ ДНІ

**Менавіта такая розніца ў часе існуе паміж «Звяздой» і яе чытачкай Валянцінай Выхотай. Першы нумар газеты, як вядома, выйшаў у 1917 годзе, а Валянціна Адамаўна нарадзілася ў 1922-м. Сёлета ў абедзвюх юбілей: Валянціне Адамаўне 5 жніўня спаўняецца 90 гадоў, а літаральна праз колькі дзён — 9 жніўня — 95-гадовы юбілей святкуе «Звязда». Нашы карэспандэнты напярэдадні завіталі да сваёй чытачкі (кандыдата педагагічных навук, перакладчыка з нямецкай мовы, паэтэсы, якая выдала ўласную кніжку з вершамі — пра ўсе справы Валянціны Адамаўны цяжка расказаць двума словамі) і пагутарылі з ёй пра тое, чым жыве сама і што раіць іншым.**

## Пра жыццё

— Якое ж яно цікавае, гэта проста неверагодна, — прамаўляе з усмешкай Валянціна Адамаўна. Нарадзілася яна ў Мінску і, як сама расказвае, «хадзіла ў рускую школу». У хаце бацькоў, пакуль расла, чула ажно тры мовы: бацька часта размаўляў па-нямецку, мама гаварыла па-руску, а жанчына, што выхоўвала тату нашай субяседніцы, «бабуня», як называе яе Валянціна Адамаўна, была польскамоўнай і часам брала малую Валю з сабой у касцёл. Беларускую мову наша чытачка вучыла ў школе. Па-польску дзяўчынка, тым не менш, не загаварыла, а вось нямецкая мова — яшчэ адна родная.

На грошы, якія атрымлівала, працуючы над перакладам мастацкіх тэкстаў з нямецкай мовы, разам з мужам пабудавала дом, у які мы завіталі з візітам... Каваныя вароты, абвітыя нейкай сімпатычнай раслінай, якая аказалася кітайскім лімоннікам («Паляўнічы ў тайзе зможа перажыць чатыры дні без ежы, калі натрапіць на гэтыя ягады», — патлумачыла пасля гаспадыня), вакол дарожак у двары растуць кусцістыя папараці. У іх, як пасля высветлілася, на працягу ўсёй нашай размовы хаваўся чорна-белы кот Філька, які, аказваецца, зусім не хоча есці пячоначны паштэт, аддаючы перавагу выключна мясному. Садовыя ажыны — нібы вялікая агароджа, далей — дом. Вялікія пакоі з высокай столлю, старадаўняя драўляная мэбля, якой няма зносу, пішучая машынка «OPEL», за якой Валянціна Адамаўна і цяпер часам працуе.

Падчас знаёмства з домам і расповедамі пра яго неяк нечакана пераходзім да размовы пра час мінулы і час цяперашні:

— У гады маёй маладосці модна было насіць сарафаны, з якімі апраналася яшчэ нешта накшталт кофтачкі ці накідкі. Яе не апранеш — застаюцца адкрытымі рукі і крыху — спіна і плечы. Калі жанчына ішла па вуліцы без гэтай накідкі, яе маглі забраць у міліцыю.

Сёння гэткі фасон на фоне кароценькіх спаднічак-сукеначак выглядаў бы больш чым сціпла і прыстойна. Звышкароткае міні і дэкальтэ — даўно не навіна. «Ну што ж, век такі», — рэзюмуе Валянціна Адамаўна.

На пытанне, якую параду можа даць маладым людзям чалавек, які мае за плячыма такое доўгае жыццё, Валянціна Адамаўна адказвае так: «Аддавайце адно аднаму самыя лепшыя пачуцці, якія толькі маеце».

## Пра даследаванні і дасціпныя вершы

Валянціна Выхота — аўтарка шматлікіх даследаванняў па тыпалогіі літаратурнай творчасці. Кніга, выданнем якой жыве цяпер, называецца «Славесныя вобразы Якуба Коласа ў паэме «Новая зямля» і ў нямецкай літаратуры»:

— Яна ўжо амаль гатова, проста ў выдавецтве крыху сапсавалі, дапусціўшы некаторыя памылкі і недакладнасці, — паказвае аўтарка кнігу, дзе чырвоным стрыжнем ужо адзначыла ўсе заўвагі. — Вось хутка абяцаюць перавыдаць. Вельмі хачу, каб кніжка выйшла.

Цікава, што адным з аспектаў даследавання ў гэтай працы сталі беларускія і нямецкія словы агульнага паходжання.

Што ж датычыцца вершаў, то пра іх Валянціна Адамаўна сама кажа так:

— У мяне няма лірыкі, вобразнасці, гэта, хутчэй, крыху смешныя, дасціпныя замалёўкі.

Замалёўкі — пра мужчын, пра жанчын, дзяцей, грошы, гарэлку. Усяго не пералічыць.

## Пра «Звязду»

Пытаюся, як даўно Валянціна Адамаўна чытае нашу газету, па журналісцкай звычцы чакаю адказу з дакладнымі лічбамі, і тут жа вымушана атрымаму адказу здзівіцца:

— Колькі? І не ведаю, здаецца, заўжды. «Звязда» — гэта мая газета. Я яе сама прачытваю, а пасля яшчэ і суседу аддаю, — Валянціна Адамаўна паказвае газетныя старонкі з артыкуламі, што яе зацікавілі.

З нядаўніх — гісторыя яўрэйскага хлопчыка, якога выратавала і выхавала жанчына-беларуска, а таксама артыкул пра знаёмства Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У Валянціны Адамаўны, дарэчы, ёсць вершы, у якіх упамінаецца «Звязда». Вось, напрыклад, такая рыфмоўка:

*Паўсюль бачым: «Скідка, скідка»,*
*Бы даўнейшая кібітка.*
*І не ўгледзіш слова «зніжка»,*
*Знікла, быццам ашчадкніжка.*
*Дзякуй клопатам «Звязды»!*
*«Зніжка» будзе ў нас заўжды!*

І яшчэ пра газету і беларускую мову:

*І навошта час губляць?*
*«Звязду» трэба пачытаць.*
*Бо яна на роднай мове —*
*Ладу нашага аснове.*

Як аказалася, прыносіць наша выданне сякую-такую практычную карысць і асабіста Валянціне Адамаўне:

— Вось нядаўна чытала ў «Звяздзе» гараскоп, я Леў. І там напісалі, што «ў сераду будзе нейкае здарэнне, што вас надта ўцешыць». Ну дык сапраўды: вы патэлефанавалі і ў госці прыйшлі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

■

# КАЛІ МІНУЛА ПАЎСТАГОДДЗЯ...

Якой «Звязда» сустрэла сваё 50-годдзе? Якія тэмы хвалявалі ў той час аўтараў? Між іншым, матэрыялаў, прысвечаных уласнаму юбілею, у падшыўцы за 1967 год амаль не было. Можна ўзгадаць толькі перадавы артыкул за 9 жніўня 1967, звернуты да чытачоў. Як адзначае «Звязда», «паміж газетай і чытачамі трывала ўсталяваліся самыя дружалюбныя адносіны...»:

*«Правераны барометр — рэдакцыйная пошта — паказваў на «ясна»: рос паток пісьмаў. Калі ў 1956 годзе іх было атрымана 14.550, то ў 1961 — 22.097. Колькасць пісьмаў працягвала расці і дасягнула ў мінулым годзе 30.202...*

*Нашы чытачы — рабочыя і калгаснікі, інжынеры і аграномы, настаўнікі і вучоныя, артысты і пісьменнікі, людзі самых розных прафесій — інфармуюць рэдакцыю аб усім, вартым увагі грамадскасці. Штодня у пошце знаходзім хвалюючыя радкі аб атрыманых перамогах. У строй дзеючых уступаюць заводы, цэхі. Гасцінна адчыняюцца дзверы школ, універмагаў, упершыню падымаюцца заслоны ў новых сельскіх клубах. Гэтыя на першы погляд звычайныя звесткі і ёсць слаўны летапіс Стварэння...*

*Дарагія чытачы, вы падказваеце рэдакцыі, пра што пісаць. Грамадскія дзеячы, нястомныя шукальнікі шляхоў павышэння эфектыўнасці прамысловасці і ўздыму сельскай гаспадаркі. Вы бачыце, як можна палепшыць арганізацыю працы, клапоціцеся, каб быў падхоплены добры пачын вашага таварыша... Вось чаму ў вашых допісах заўсёды новыя тэмы, праблемныя пытанні...».*

Юбілею «Звязды» прысвечаны артыкул за 26 жніўня, у якім распавядаецца, што ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета адбыўся ўрачысты сход грамадскасці Мінска, прысвечаны 50-годдзю з дня выхаду першага нумара газеты «Звязда», а таксама ўручэнню ёй высокай урадавай узнагароды — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Тады пад бурныя апладысменты прысутных першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Пётр Машэраў прымацаваў ордэн да сцяга газеты «Звязда», які вынеслі рэдактар газеты В.А. Пыжкоў, памочнік майстра Віцебскага дывановага камбіната, Герой Сацыялістычнай Працы П.Д. Клімкоў, друкар друкарні «Звязда» М.Г. Баркун.

У сваёй прамове Пётр Міронавіч Машэраў адзначыў: *«...На ўсіх этапах, праз якія прайшлі за 50 гадоў савецкай улады ўся наша краіна і рэспубліка, «Звязда» была і застаецца паслядоўнай партыйнай газетай, выказнікам дум і спадзяванняў працоўных...*

*Прафесія савецкага журналіста як бы злучае ў сабе складанасць і адказнасць працы партыйнага работніка з працай літаратара. Журналіст заўсёды знаходзіцца ў гушчыні жыцця, нярэдка з'яўляецца і першаадкрывальнікам праблем, і барацьбітом за іх практычнае вырашэнне. Да савецкага журналіста, як да партыйнага работніка, звяртаюцца людзі за парадай, падтрымкай і дапамогай. Ён павінен валодаць здольнасцю так аналізаваць пачутае і ўбачанае і так супастаўляць факты і думкі, адбіраць самае істотнае і тыповае, каб з усёй масы атрымліваемай ім інфармацыі рабіць аб'ектыўныя і правільныя вывады».*

## Юбілей

Затое ў падшыўцы 1967 года багата матэрыялаў, прысвечаных іншаму 50-годдзю — Кастрычніцкай рэвалюцыі. У гэты час у газеце выходзіць шэраг адпаведных рубрык: «Крокі Вялікага Кастрычніка», «Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка», «Кастрычнік і Беларусь», «Эстафета векапомных гадоў», «Шолах старонак гісторыі», дзе падаецца багата інфармацыі па гісторыі, параўноўваецца, якой краіна была паўстагоддзя таму і як змянілася за час існавання Саветаў. Напрыклад, 12 ліпеня газета пісала:

*«...Старажылы памятаюць, наколькі адсталай была наша дакастрычніцкая Беларусь. У гарадах дапатопныя станкі і прымітыўныя прыстасаванні, на полі саха з'яўляліся асноўнымі прыладамі ў руках прыгнечаных капіталістамі і памешчыкамі рабочых і сялян. Цяпер жа... Беларусь ператварылася ў магутную індустрыяльна-калгасную рэспубліку.*

*...Мінск, у мінулым горад конкі, вузкіх і брудных вулачак і непрыглядных дамоў, да таго ж ушчэнт разбураны ў час Вялікай Айчыннай вайны, ператвораны ў адзін з прыгажэйшых гарадоў Савецкага Саюза. Рукамі мінчан ствараюцца аўтамабілі, станкі, дакладныя прыборы, абсталяванне для самых розных галін народнай гаспадаркі і многія іншыя вырабы...*

*Радуюць поспехі калгасаў і саўгасаў рэспублікі, росквіт калгаснай вёскі,... у якой пачынаюць высіцца цагляныя дамы, у якую крочаць электрычнасць, газ, водаправод...»*

У гэтым годзе ў краіне ладзілася багата мерапрыемстваў, прысвечаных 50-годдзю савецкай дзяржавы. Прычым толькі выставамі, творчымі і партыйнымі сустрэчамі, канцэртамі справа не абмяжоўвалася. На прадпрыемствах і ў арганізацыях разгортваліся спаборніцтвы:

*«...Гэта будзе год смелых здзяйсненняў і шырокага разгортвання народнай ініцыятывы, — пісала «Звязда» ў студзені. — Няма цяпер ніводнага фабрычна-заводскага калектыву ў нашай рэспубліцы, які б не завёў рахунак шчодрых спраў у гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка.*

*...Вялікія справы нас чакаюць у 1967 годзе. У рэспубліцы прадугледжан больш магутны размах сельскагаспадарчага машынабудавання... Па дарогах паімчацца 40-тонныя волаты «БелАЗ». Сям'я ўдарных будоўляў папоўніцца Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводам, Добрушскім цэлюлозным і некаторымі іншымі важнымі аб'ектамі. Сотні прадпрыемстваў атрымаюць больш дасканалыя станкі і машыны. Узброяцца сродкамі аўтаматыкі і электронікі...».*

## Вёска мяняе аблічча

Адна з тэм, якая ў гэты час шырока абмяркоўвалася на старонках «Звязды», звязана з будаўніцтвам на вёсцы. Аўтары хвалююцца, што *«...вялікая колькасць населеных пунктаў не мае яшчэ праектаў і схем планіроўкі забудовы, частыя выпадкі, калі планіроўка парушаецца, будаўніцтва вядзецца бессістэмна... Шмат дзе карыстаюцца устарэлымі, непрыгожымі і нязручнымі праектамі жылых дамоў і культурна-бытавых будынкаў...»*, у той час як вёскі ўжо павінны ператварацца ў «добраўпарадкаваныя калгасныя і саўгасныя пасёлкі з усімі дабротамі сацыялістычных гарадоў».

19 лютага ў «Звяздзе» друкуецца вялікі артыкул «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў вёсцы»:

*«...Праектным арганізацыям пры прывязцы праектаў грамадскіх будынкаў трэба творча выкарыстоўваць мясцовыя ўмовы і асаблівасці ўчасткаў забудовы, павысіць якасць вырашэння фасадаў і ўнутранай планіроўкі гэтых будынкаў, іх ролю ў фарміраванні архітэктурна-мастацкага аблічча вёскі.*

*Міністэрству бытавога абслугоўвання насельніцтва БССР, Белкаапсаюзу прапанавана перайсці ў 1968 годзе ад разрозненага будаўніцтва аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання да комплекснага будаўніцтва гандлёвых цэнтраў, якія ўключаюць магазіны, сталовыя і камбінаты бытавога абслугоўвання...*

*Міністэрства сувязі БССР павінна забяспечыць у гэтай пяцігодцы далейшае развіццё сродкаў сувязі ў вёсцы. Пры будаўніцтве ўнутрывытворчай сувязі ў саўгасах і калгасах устанаўліваць тэлефоны ў сельскіх школах, бальніцах, клубах, бібліятэках, дзіцячых садах і іншых культурна-бытавых установах...*

*Міністэрству бытавога абслугоўвання насельніцтва БССР даручана ў 1967-1968 годзе арганізаваць у раённых цэнтрах рэспублікі майстэрні-атэльне па ўстаноўцы тэлевізійных антэн, настройцы і рамонту тэлевізараў...»*

## Праблемы вышэйшай школы

Артыкул з такой назвай выйшаў 15 лютага 1967 года. У ім міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. Дарашэвіч распавёў, што:

*«У Беларусі цяпер ёсць 28 ВНУ, у якіх навучаецца 116 тысяч студэнтаў. У 126 сярэдніх спецыяльных навучальных установах займаецца больш як 134 тысячы чалавек. На 10 тысяч насельніцтва ў нас прыпадае студэнтаў больш, чым у любой капіталістычнай краіне.*

*...Некаторыя міністэрствы і ведамствы слаба ведаюць і дрэнна вывучаюць, колькі і якіх спецыялістаў ім патрэбна ў бліжэйшы час і ў больш далёкай перспектыве. Гэта прыводзіць да таго, што настойліва дабіваючыся арганізацыі падрыхтоўкі кадраў па тых або іншых спецыяльнасцях, яны праз два-тры гады ўжо адмаўляюцца ад такіх спецыялістаў...*

*Расшырэнне сеткі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, разгортванне падрыхтоўкі кадраў па раду новых спецыяльнасцей, штогадовы рост прыёму ў ВНУ і тэхнікумы выклікалі неабходнасць значнага павелічэння колькасці прафесарска-выкладчыцкага саставу. Калі ў 1960 годзе ў ВНУ міністэрства працавала 1790, а ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах —1480 выкладчыкаў, то ў цяперашні час іх колькасць узрасла адпаведна да 4425 чалавек у ВНУ і да 2960 чалавек у тэхнікумах...*

*Цяжка гаварыць аб прадукцыйнай вучобе студэнцкай моладзі, калі бібліятэцы ВНУ або тэхнікума даводзіцца выдаваць адзін падручнік на 5-10 чалавек, а то і на цэлую групу...».*

## Беларускія сувеніры

У юбілейны год «усплыла» і такая праблема, як небагаты асартымент беларускіх сувеніраў.

*«...Расшырэнне міжнародных і культурных сувязей, арганізацыя сусветных і нацыянальных выставак, правядзенне розных спартыўных і іншых мерапрыемстваў абавязваюць павялічыць выпуск сувеніраў і значна палепшыць іх якасць...*

*І вось летась па рашэнню ўрада Беларусі Міністэрства гандлю БССР правяло конкурс на стварэнне новых узораў мастацкіх сувеніраў і памятных падарункаў... Быў адзначаны актыўны ўдзел у гэтым мерапрыемстве мастакоў і народных умельцаў. Яны стварылі і прадставілі на разгляд звыш 500 новых сувеніраў. Тут вырабы са шкла, фарфору і керамікі, металу і пластмас, драўніны і тканін. Значная колькасць іх адлюстроўвае нацыянальныя традыцыі, прыгожыя мясціны рэспублікі, веліч гарадоў. Шмат сувеніраў бытавога характару...».*

Дарэчы, неблагая ідэя правесці такі конкурс зараз. У Беларусі праходзяць разнастайныя міжнародныя сустрэчы, развіваецца турызм, блізіцца чэмпіянат свету па хакеі, але да гэтага часу ў нас няма нейкага адзінага сувенірасімвала.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

■ Ліст у рэдакцыю

# «ЁН БЫЎ СЛУГОЙ БАГІНІ ШАХМАТ...»

## НЕКАЛЬКІ АБЗАЦАЎ У ПРАЦЯГ ДАКУМЕНТАЛЬНАГА АПОВЕДУ ПРА МАЙГО БАЦЬКУ Г.М. ВЕРАСАВА

**Апошнім часам брэндавы від спорту — футбол. А вось у 30-я гады мінулага стагоддзя гэткім жа брэндавым відам з'яўляліся шахматы. Ва ўяўленні многіх людзей умельства добра гуляць у шахматы сведчылі найперш пра інтэлект і ўзровень культуры чалавека. У перадваенныя часы краіна Саветаў перажывала сапраўдны шахматны бум. Старажытнай гульнёй бавіліся ўсе: ад школьнікаў і студэнтаў да чыноўнікаў і военачальнікаў. Шахматныя чэмпіянаты Саюза збіралі масавыя аўдыторыі. Па радыё рэгулярна вялі рэпартажы аб гэтых турнірах і да пачатку трансляцый спяшаліся дадому гэтак жа шпарка, як сёння спяшаюцца балельшчыкі да паказу ў прамым тэлеэфіры спаборніцтваў з арэн Алімпіяды-2012 у Лондане.**

Мой бацька гэтаксама стаў сталым удзельнікам буйных шахматных турніраў. Хаця меў усяго толькі першую катэгорыю (было яму тады 22 гады). Аднак ужо ў першым прэстыжным чэмпіянаце СССР 1934 года бацька выклікаў фурор — атрымаў 9 перамог без адзінага мірнага пагаднення (выпадак унікальны!), і адразу яго імя стала вядомым на ўвесь Саюз.

Гаўрыла Мікалаевіч быў чалавекам сціплым: я ведаў пра бацькавы дасягненні ў шахматных дуэлях з вядомымі гросмайстрамі і майстрамі, а вось пра грамадскі рэзананс ягоных даваенных поспехаў даведаўся пазней. Напрыканцы 1970-х, калі ён мужна змагаўся з цяжкай хваробай, дырэктар анкалагічнага Інстытута імя Герцана ў Маскве акадэмік Паўлаў падчас абследавання сказаў бацьку: «Гаўрыла Мікалаевіч, а ваша прозвішча перад вайной без перабольшвання грымела ў асяродку знаўцаў шахматнай гульні на абсягах Саюза ССР...»

На фронце, у 1942 годзе, бацька быў цяжка паранены, і камандзір вайсковай часці паставіў подпіс пад пахаванкай: «Гаўрыла Верасаў загінуў...» Аднак здарыўся цуд — бацька застаўся жывым... Вайна ж, па сутнасці, паставіла крыж на магчыма зорнай кар'еры самабытнага шахматыста, але ў той жа час дала штуршок у іншым напрамку: пасля вайны, пасля працы ў Міністэрстве замежных спраў БССР і вучобы ў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС кандыдата гістарычны навук Гаўрылу Мікалаевіча прызначаюць на пасаду старшыні праўлення Беларускага таварыства культурнай сувязі з замежжам, дзе ён працаваў з 1952-га па 1958 год. На гэтай адказнай пасадзе дысцыплінаваны, прывучаны шахматамі да свабоды ў творчасці, да пошуку і прыняцця нестандартных рашэнняў, бацька ў асяродку чыноўнікаў, як мне здаецца, адчуваў сябе не вельмі камфортна. Затое яго заўсёды вабілі стасункі з людзьмі творчымі, таленавітымі, карацей, з асобамі выдатнымі. У асяродку яго сяброў былі пісьменнікі Іван Стаднюк, Іван Шамякін, паэты Аркадзь Куляшоў, Максім Лужанін, драматург Андрэй Макаёнак, скульптары Заір Азгур і Андрэй Бэмбель, мастак Зянон Паўлоўскі, акцёр тэатра і кіно Раман Філіпаў, акадэмікі Фёдар Канстанцінаў і Яўген Канавалаў.

Дзе б бацька ні працаваў, якімі грамадскімі справамі ні быў заняты, кожную вольную хвіліну ён прысвячаў шахматам. І ўвогуле яго немагчыма было застаць, каб нічога не рабіў. Здаралася (я таму сведка), бацька да світання аналізаваў шахматныя партыі, чытаў энцыклапедыі, даведнікі. Захапляўся і добра ведаў літаратуру, айчынную і замежную (гэта, у прыватнасці, былі творы з яго любімых часопісаў «Новый мир», «Иностранная литература», «Современник», «Юность», «Неман», «Наука и жизнь», шмат чытаў кніг і перыёдыкі на польскай мове) і, як мне падаецца, аддаваў перавагу творам глыбокім, з філасофскім падтэкстам.

У сярэдзіне сямідзясятых гадоў бацька прымаў удзел у турнірах ужо калі-нікалі, аддаваў перавагу шахматнай аналітыцы. Прааналізаваўшы сотні партый, згуляных у розныя гады вядомымі шахматыстамі свету, Гаўрыла Мікалаевіч прыйшоў да высновы, што тыя ці іншыя перамогі нават такіх легендарных гросмайстраў, як Р. Фішар, М. Таль, А. Карпаў, — вынік... памылак іх саперніка. А гэтая акалічнасць падказала яму звярнуць увагу на феномен, які можна назваць «практычнай бясконцасцю шахмат пры іх тэарэтычнай канчатковасці». Магчыма, я памыляюся, але мой бацька першым агучыў ідэю пра стварэнне навукі аб памылках з дапамогай шахмат, якія знаходзяцца на памежжы канечнага і бясконцага. Як і само жыццё...

**P.S.** *28 ліпеня споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Гаўрылы Мікалаевіча Верасава — беларускага шахматыста і грамадскага дзеяча. Пасля яго адыходу ў іншы свет мінула амаль 33 гады. Тэрмін дастатковы, каб забыць чалавека. Але, як высветлілася, яго памятаюць вучні-шахматысты верасаўскай школы. Гэта сведчыць аб тым, што сваё жыццё ён пражыў яскрава і годна.*

*Карыстаючыся нагодай, мне хацелася б падзякаваць усім, хто адгукнуўся з нагоды юбілейнай для нашай сям'і даты, за светлую памяць пра бацьку. Лічу сваім абавязкам падзякаваць таксама рэдкалегіі газеты «Звязда», у якой бацька працаваў у даваенныя гады ў якасці літаратурнага супрацоўніка, за прадастаўленне старонкі для публікацыі дакументальнага аповеду пра жыццёвы і творчы шлях Гаўрылы Мікалаевіча.*

**Валерый ВЕРАСАЎ, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі, доктар біялагічных навук**

■

■ Кватэрнае пытанне

# НА ЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ РАЗЛІЧВАЦЬ МОЖНА... КАЛІ?

***Мы з жонкай — гараджане, як той казаў, выраслі на асфальце. А вось жыць вельмі хацелі б на зямлі, у сваім доме... Пры якім памеры даходу сям'я можа атрымаць ільготны крэдыт на яго будаўніцтва?***

**С. С.,** *г. Брэст*

Палажэннем, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2000 г. № 1955 (з наступнымі змяненнямі і дапаўненнямі) да малазабяспечаных грамадзян, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання, аднесены грамадзяне, у якіх, у прыватнасці, сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае трохразовага сярэднямесячнага сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту (МСБ) сям'і з 4 чалавек, вылічанага за 12 месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу падачы дакументаў для ўключэння ў спісы на атрыманне льготнага крэдыту (з 1.08 па 31.10.2012 г. — 1 млн 332 тыс. 100 рублёў, адпаведна трохразовы — 3 млн 996 тыс. 300 рублёў).

Акрамя таго, названым Палажэннем вызначана, што пры аднясенні грамадзян да катэгорыі маючых права на атрыманне льготных крэдытаў (і адпаведна — уключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне) акрамя сукупнага даходу ў сям'і, павінна ўлічвацца і маёмаснае становішча гэтай сям'і. У прыватнасці, на атрыманне льготнага крэдыту могуць прэтэндаваць грамадзяне, якія маюць заяўленую маёмасць, агульны кошт якой не перавышае двухразовага гранічнага памеру льготнага крэдыту для гэтай сям'і.

Для аднясення грамадзяніна да катэгорыі малазабяспечаных ён прадстаўляе звесткі пра сукупны даход і маёмаснае становішча сям'і ў орган, у якім ён стаіць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па адзінай форме, зацверджанай у вызначаным заканадаўствам парадку.

У склад маёмасці сям'і, якая ўлічваецца, уключаюцца прыналежныя на праве ўласнасці:

жылыя дамы з надворнымі пабудовамі, дачы і садовыя домікі, гаражы, гаспадарчыя і складскія памяшканні, іншыя пабудовы і не завершаныя будаўніцтвам аб'екты, кватэры, у тым ліку тыя, што знаходзяцца ў іншых населеных пунктах, а таксама іх часткі (долі);

транспартныя сродкі (акрамя матаедаў, веласіпедаў і гужавога транспарту), кошт кожнага з якіх перавышае 35-разовы памер зацверджанага сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з 4 чалавек, які дзейнічае на дзень падачы дакументаў для ўключэння ў спісы на атрыманне льготнага крэдыту, за выключэннем спецтранспарту, набытага ў адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі праз органы сацыяльнай абароны бясплатна або на льготных умовах.

Звесткі аб маёмасным становішчы сям'і павінны быць пацверджаны дакументальна. Грамадзяне абавязаны паведамляць адпаведнаму органу пра ўсе змяненні маёмаснага становішча сям'і, якія адбыліся з моманту падачы дакументаў для ўключэння ў спісы на атрыманне льготнага крэдыту і да заключэння крэдытнага дагавора з адкрытым акцыянерным таварыствам «Ашчадны банк «Беларусбанк».

**Віктар САВІЦКІ**

■

## НА ВЫШЫНІ, З КРЫВАЦЁКАМ

45-гадовы гамяльчанін, які працаваў мантажнікам у Хойніках, сарваўся з вышыні і трапіў на адну з будаўнічых канструкцый. Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, апоўдні на Хойніцкі ўчастак па вытворчасці камбікармоў мясцовага сельгаспрадпрыемства тэрмінова выклікалі выратавальнікаў і медыкаў. Дапамога спатрэбілася мужчыну, які ў той момант з моцным крывацёкам знаходзіўся на верхнім узроўні зернесушыльнага комплексу — на вышыні каля 10 метраў. Самастойна спусціцца па вертыкальных лесках мантажнік не мог. Супрацоўнікі МНС пры дапамозе выратавальнай вяроўкі апусцілі чалавека на зямлю. Брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі пацярпелы дастаўлены ў Хойніцкую бальніцу з рэзанай ранай грудной клеткі. Прычыны здарэння высвятляюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ШАХМАТЫ

**Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА**

**ПАДУМАЙ І РАШЫ**
В. Тупік (Пружанскі раён)
В. Жук (Брэст)



**Белыя**: Крс4, Лс8, Ch4, Ке2, пп. a4, e4 (6).

**Чорныя**: Крh2, Cg2, Kg6, пп. a2, e5 (5).

Выйгрыш.

В. Тупік (Пружанскі раён), В. Жук (Брэст)



**Белыя**: Крa2, Лb2, Cf7, пп. c3, d4 (5).

**Чорныя**: Крa4, Лс6, Kf8, пп. a5, c7, d5, d6 (7).

Выйгрыш.

Чакаем вашых адказаў.

**ПРАВЕРЦЕ СВАЕ АДКАЗЫ**

Змяшчаем рашэнні эцюдаў У. Брона, апублікаваных 26 чэрвеня г.г.

У. Брон. «Шахматны лісток», 1929 г.

1. Kb4! K:e3+! 2. Крe2 K:d1 3. Cb8+ Крс5 4. Kd3+ Крd4! 5. Ce5+ Крс4 6. Cg7! Ke3 7. Kf2+ Крf4 8. Ch6+ і выйгрыш.

У. Брон. «Шахматы», 1929 г.

1. Лс8+! Крe7 2. Лс7+ Крe6! 3. Лс6+ Крe5! 4. Лс5+ Крe4! 5. Лс4+ Крe3+ 6. Л:g4 f2 7. Лg3+ Крe4! 8. Лg4+ Крe5 9. Лg5+ Крe6 10. Лg6+ Крe7 11. Лg7+ Крf8 12. Лg5! f1Ф 13. Лf5+ Ф:f5 і пат.

**МАЛАВЯДОМЫЯ ДЭБЮТЫ**

Любы першы ход, які б ні зрабілі белыя ці чорныя, зусім правамоцны. Таму не трэба здзіўляцца, калі вы сустрэнецеся з такімі пачаткамі, як, напрыклад, 1. g4 — дэбют швейцарскага майстра Гроба, 1. a3 — дэбют Андэрсена, 1. c3 — сарагоскі пачатак і г.д. Такія дэбюты не маюць самастойнага значэння і вельмі рэдкія ў сучаснай практыцы. А калі ваш сапернік робіць першы ход, які-небудзь «не такі», запомніце — прамога абвяржэння яго не існуе. Мабілізуйце сваё майстэрства і падкрэсліце ценявыя бакі эксперыменту. Праўда, гэта не заўсёды ўдаецца.

Вось прыклад. М. Шарашэўскі — А. Палікарпаў. 1974 г.

Няправільны пачатак. 1. h3 e5. 2. e4 Kf6 3. Kc3 d5 4. ed K:d5 5. Kf3 Kc6 6. Cb5 K:c3 7. bc Cd6 8. o-o o-o 9. Le1 Le8 10. d4 e4 11. Kg5 Cf5 12. Cc4 Cg6 13. Фg4 Le7 14. a4 Ka5 15. Ca2 Фc8 16. Cd2 h6 17. c4 Ф:g4 18. hg hg 19. c5 Cf4 20. C:a5 cb 21. g3 Cc7 22. Cd2 Лd7 23. c3 Ca5 24. Le2 b6 25. cb ab 26. Лc1 b5 27. ab cb 28. C:g5 Лc8 29. Cd2 Крf8 30. Le3 Cd8 31. Лc2 Ca5 32. Крg2 33. Лh1 Крe7 34. f4 f5 35. gf C:f5 36. Лh5 Крf6 37. Лg5 b4 38. cb Cb6 39. d5 і чорныя здаліся.

Наш культурны асяродак
ЖЫВАНДОЛЯ
Выпуск № 25 (154)

■ Асабістае

# «СВАБОДА АЎТАРСКАЙ ПРЫСУТНАСЦІ» ЯНКІ БРЫЛЯ

## 4 жніўня народнаму пісьменніку Беларусі Янку Брылю споўнілася б 95

**Як дзіўна ўсё ж атрымалася: мы шмат разоў гутарылі — але ні разу Іван Антонавіч не пагадзіўся на размову «для друку».**

Калі 20 гадоў таму, у 1992-м, я толькі пачынала працаваць у «Звяздзе», адно з заданняў было: падрыхтаваць матэрыял да 75-годдзя Брыля. Ён равеснік нашай газеты, нарадзіўся ў жніўні, і ў гэты спякотны час — вядомая справа, заўсёды на лецішчы. Як не «скаціцца» да дзяжурнага «датскага» матэрыялу (так звычайна называюць публікацыі, прымеркаваныя да пэўнай даты)?..

Напісалася замалёўка вельмі асабістага гучання, гэта было прызнанне ў любові да народнага пісьменніка і — да Настаўніка. Многія гады, пачынаючы са студэнцтва, каб лепш адчуць Брылёву мову (родную мову!), выпісвала яго назіранні за жыццём. Узгадалася: калі пачала чытаць творы Брыля ўпершыню, адразу неяк унутрана страпянулася. Гэта было адкрыццём не толькі цікавага пісьменніка, але і адкрыццём... роднай мовы.

Спачатку, магчыма, мовы: атрымлівала ні з чым не параўнальную асалоду ад прачытанага. Які цуд: «мляўкі смак халоднай, нішчымнай заціркі», «акунь шалпатаўся ў атаўцы»... Так проста, немудрагеліста — і так хораша! Я гадавалася ў вёсцы і чула менавіта такую, смачную народную мову. Але ж у многіх выпадках з друкаванага беларускага слова знікла нешта невытлумачальнае — як вітамін з ежы.

А тут — ажно дух заняло: чыстаюткая мова! Мае памкненні былі падзіцячаму дзёрзкія: толькі паступіла на журфак, хацелася і самой пісаць гэтак жа натуральна, дасканала.

Каб лепш адчуць, асэнсаваць Брылёву мову, у асобны сшытак выпісвала трапныя, дасціпныя і дакладныя словы, прыслоўі, роздумы.

Хіба не раскоша: «На клумбе — згорбілася і расставіла рукі, як бабуля над градамі, старая, няшчасная яблыня» («*Птушкі і гнёзды*»).

Можна бясконца захапляцца дзівосамі нашай мовы і амаль чарадзейным майстэрствам пісьменніка. А ён і сам прызнаецца: «Гэта нармальна, што ў мяне яно ёсць, было і будзе — адчуванне роднай зямлі, народа, мовы, — нягледзячы ні на што. Я быў рады, знайшоўшы гэтую сцежку ў юнацтве, яна мяне вядзе і сёння, даволі часта грэючы і адаграваючы запаветным цяплом».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

...З часам дзёрзкасць, вядома, прайшла, а сшытак — застаўся... І зараз ён — на маім пісьмовым стале. Зноў з задавальненнем перачытваю творы Янкі Брыля, у якіх не жменя — цэлыя ахапкі сонечных промняў!

* * *

Пасля той публікацыі на адрас рэдакцыі прыйшоў ліст ад Івана Антонавіча. Ён шчыра дзякаваў і гэтак жа шчыра здзіўляўся, чаму журналістка (меркаваў, што аўтарка іншая) падпісалася псеўданімам «Таццяна Падаляк». А потым і сам патэлефанаваў у «Звязду». Далікатнасць—выхаванасць—культура...

*А, напэўна, нямногія ведаюць, што гэты чалавек па-сапраўднаму эпіцыклапедычнага досведу скончыў... толькі сямігодку. Але ўвесь час займаўся самаадукацыяй. Жыццёвы шлях быў няпростым. У 1939-м жыхар Заходняй Беларусі Янка Брыль быў прызваны ў польскую армію, у верасні трапіў у нямецкі палон, адкуль уцёк у 1941-м... З 1942 года быў сувязным партызанскай брыгады імя Жукава Баранавіцкага злучэння, потым — партызанам-разведчыкам брыгады «Камсамолец», рэдактарам газеты «Сцяг свабоды» і сатырычнага антыфашысцкага лістка «Партызанскае жыгала». З кастрычніка 1944-га — у Мінску, працаваў у рэдакцыі газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», у часопісах «Вожык», «Маладосць», «Полымя»...*

...Праз нейкі час Іван Антонавіч завітаў у рэдакцыю, зайшоў і да мяне — пазнаёміцца. Не ўтрымаўся: «Во-ой, якая маленькая!..»

Ён жа быў сапраўдны волат — высокі, прыгожы, магутны. Беларускі зубр!

Напісалася так — і адразу падумалася: а і праўда ж, беларускі зубр — ва ўсіх сэнсах...

* * *

...Многія гады раблю выпіскі з Брылёвых кніг — каб уласнаю рукою «пакаштаваць» смачнае, сакавітае Слова.

*З «агульнага сшытка» выпісак з твораў Янкі Брыля:*

«У ментарскім артыкуле — пра «новы жанр» у нашай літаратуры. Чаргаванне, скажам, такое: жанр гусінага пяра, жанр пішучай машынкі, а сёння ўжо і жанр магнітафонны?..» (лірычныя запісы «Вячэрняе»: Полымя, 1993. № 6. С.19).

«Прадаваць свае мазгі за мяжу не зможа той, у каго яны непарыўна знітаваны з сумленнем сына свайго народа. Ёсць філасофія пацукоў, што бягуць з карабля, і філасофія капітанаў, якія пакідаюць яго апошнімі, а то і зусім не пакідаюць». (Тамсама. С. 68).

* * *

...Калі «набівалася» на інтэрв'ю, Іван Антонавіч аднекваўся, тлумачыў: «Шмат работы: сам друкую і чарнавое, і белавое. Калі аддаць перадрукоўваць, давядзецца заплаціць палову ганарару...».

Здзіўляўся: «Хіба можна адказаць на сённяшнія пытанні?!.»

* * *

Праходзіць яшчэ пяцігодка, і зноўку заданне — падрыхтаваць публікацыю да 80-годдзя Янкі Брыля. Якім шляхам ісці?.. Раптам асяніла: а няхай раскажуць пра пісьменніка калегі-літаратары.

Каго ўдалося адшукаць — у горадзе, на лецішчы, — што называецца, за гонар лічылі сказаць слова пра Брыля. Павага да гэтага чалавека ўнікальнага таленту і вялікай душы — нязменная.

Буду шчырай: толькі адзін пісьменнік быў скупым на словы. «Заўтра з'язджаю ў Польшчу, у мяне чамаданны настрой, няма чаго казаць», — прамовіў ён і паклаў тэлефонную трубку. І цяпер не магу скеміць, чаму пра старэйшага калегу — «няма чаго казаць». А можа, усё намнога больш проста і, разам з тым, больш складана: звычайная зайздрасць да таленту?..

...У «Звяздзе» выйшла цэлая паласа, прысвечаная Янку Брылю, пад агульнай назвай «Гані мяне, доля, ад перакатных радасцей капрызнай славы...».

**Іван Шамякін:** «Мы пазнаёміліся з Янкам Брылём у 1945-м, на першым пасляваенным пленуме Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гэта незабыўны пленум, тады было ўсяго 42 члены саюза... Пасля мне пашчасціла жыць побач, у адным доме, мы хораша пасябравалі. Часта я выязджаў на радзіму да Янкі, ведаў яго братоў. Мяне заўсёды захапляе надзвычайная народнасць гэтага чалавека. Я ў яго проста вучыўся гэтай народнасці. Янка можа ў любым застоллі і паспяваць, і пажартаваць. Умее вельмі хораша напісаць, з глыбокім псіхалагізмам, з веданнем жыцця народа, яго побыту, — напісаць дасканалай беларускай мовай. Гэтаму я асабліва вучыўся ў Брыля, бо сам нарадзіўся ў цэнтральнай Беларусі, а Янка — на яе ўскраіне. Натуральна, на пачатку пісьменніцкага шляху ў мяне здараліся моўныя агрэхі... Янка Брыль — глыбокі мастак, чалавек, які шмат зрабіў. Здаралася, мы спрачаліся, разыходзіліся ў поглядах. Але што хочацца адзначыць: Янка заўсёды быў роўным у адносінах, заўсёды быў верны сябра. Хочацца пакланіцца яму за гэта».

**Віктар Казько:** «Янка Брыль — з'ява. У творчасці неабходны чалавек, з якім можна вывяраць зробленае табой; на якога азіраешся, калі сам пішаш. Такі ў нас Янка Брыль... Дай Бог кожнай літаратуры свайго Янку Брыля: калі ёсць у народа такі літаратар — значыць, ёсць у народа і літаратура».

Прыгадалася Брылёва мініяцюра:

*«З выступлення француза на тургенеўскім вечары: «Слава яго нікому не перашкаджала».*

*Там жа, у Вялікім тэатры, занатаваў гэта з прыпіскай: «Так трэба жыць». Не пра славу, вядома».*

* * *

А літаральна праз некалькі дзён пасля публікацыі прыйшоў ліст ад Івана Антонавіча...

«Мілая Таня! Не ведаю, як Вас па бацьку, ды так яно нават і зручней, каб па-бацькоўску падзякаваць Вам за тое, што Вы так хораша распавіліся са мною — і сваім словам, і арганізацыяй паласы, чытаў якую я не проста з прыемнасцю, але і з хваляваннем.

Усяго Вам добрага!

Янка Брыль.

P.S. Газету мне ўчора прывезлі з Мінска».

* * *

*...Падышла калега, спытала, ці бачыла я новую кнігу Брыля «З людзьмі і сам-насам» (Мінск, «Мастацкая літаратура», 2003). Пакуль што не... «А там і пра вас ёсць!»*

Дарагі Іван Антонавіч!..

«Шанцуе на неспадзяванкі. От сабе, так сабе купіў у кіёску «Звязду», а там, гляджу, — разумны і сардэчны артыкул Таццяны Падаляк да дня нараджэння Якуба Коласа...

Такое нам патрэбна, і заўсёды было, а сёння асабліва, — быць вышэй за драбнату ў адносінах, падтрымліваць адзін аднаго ў галоўным».

* * *

У студзені 2006 года «Звязда» распачала акцыю «Нашчадкі вогненных вёсак» — гэта быў крок своеасаблівага працягу дакументальнай кнігі «Я з вогненнай вёскі...» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка. Кніга была напісана праз 30 гадоў пасля вайны (выйшла ў 1975-м). Прайшло яшчэ 30 гадоў. Многіх Сведкаў Праўды, як назвалі сваіх суразмоўцаў аўтары, ужо не было на гэтым свеце, але сведкі жудасных трагедый «вогненных вёсак» яшчэ застаюцца. У пачатку XXI ст. пачалі з'яўляцца спробы перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, таму мы папрасілі адгукнуцца ўсіх, каму пашчасціла выжыць у вогненным пекле родных вёсак.

13 студзеня 2006 года патэлефанавала Івану Антонавічу, каб атрымаць своеасаблівае бласлаўленне на правядзенне гэтай патрыятычнай газетнай акцыі. Яго словы падтрымкі былі цёплымі, шчырымі, лаканічнымі. Але ад інтэрв'ю Янка Брыль катэгарычна адмовіўся: успаміны пра работу над кнігай «Я з вогненнай вёскі...» надта цяжкія. «Надзвычай цяжка вяртацца да гэтай тэмы,— патлумачыў пісьменнік. — Потым вы і самі зразумееце, пра што кажу».

Так, зразумела. Колькі лістоў-успамінаў давялося прачытаць! Колькі гісторый прапусціць праз сэрца! Такіх трагічна розных... З аднолькавым канцом...

Янкі Брыля не стала ў ліпені 2006-га. Адзін са шматлікіх вянкоў каля яго труны быў ад «нашчадкаў вогненных вёсак».

* * *

Янка Брыль — народны пісьменнік па сутнасці сваёй. Раман «Птушкі і гнёзды», блізкучыя аповесці, апавяданні, навелы, эсэ, лірычныя мініяцюры... Яго называюць класікам беларускай літаратуры, тонкім псіхолагам і філосафам, майстрам трапных афарызмаў і свежых метафар, паэтам у прозе.

Кожнае з гэтых вызначэнняў, безумоўна, справядлівае, але... «Калі мяне, хвалячы, называюць лірыкам, я адчуваю нейкую прыкрасць: што я вам — тэнар які, бяздумны і саладжавы?» (*з запісаў «Чытаючы апавяданні Чорнага»*).

Пра камплімenты ён гаварыў амаль што з выклікам. Чалавек, здольны іранічна ставіцца да слоў пахвальбы, — моцны і мудры. Прынамсі, іронію здаўна і невыпадкова называюць сарамлівасцю чалавецтва. Такая натуральная, традыцыйна беларуская рыса характару — не з задавальненнем, а з нейкай няёмкасцю сустракаць узвышаныя словы ў свой адрас...

«У рускіх ёсць **писатель большой и писатель великий,** а ў нас — толькі **вялікі**. А то яшчэ чуў ад адной захопленай ціхоні, што N — «вельмі вялікі пісьменнік». Хоць так наробім сабе болей класікаў!..» (*З запісаў цыкла «Хлеб надзённы»*).

Ва ўсіх творах Янкі Брыля — «свабода аўтарскай прысутнасці».

Ці не гэта — самае вызначальнае?..

**Таццяна ПАДАЛЯК** ■

# ПЕРАКЛАДЧЫК З РЫЦАРСКІМ КРЫЖАМ

**Сорак пяты год пайшоў ад тае пары, калі ў Мікалаеве ва Украіне я пазнаёміўся з паэтам Дзмітром Чараднічэнкам. Мікола Маляўка, Алесь Разанаў і я былі запрошаны на сустрэчу паэтаў саюзных рэспублік. Дзмітрый Чараднічэнка стараўся паказаць нам прывабы ўкраінскай зямлі, а я, у сваю чаргу, паказаў яму крыху пазней маё роднае Прыдзвінне, гістарычныя мясціны Беларусі.**

**Паэты і перакладчыкі — Дзмітро, яго жонка Галіна Кірпа, дачка Аляна — многа зрабілі для пераняслення чараў беларускай паэзіі на ўкраінскі кантынент. Але ёсць у Дзмітра Чараднічэнкі асаблівы ветразь, пад якім ён вось ужо трыццаць гадоў плыве ў абдоймы Вінцаса Крэвэ-Міцкявічуса, з роднай Росі на Нёман. І не толькі таму, што яго мама, народжаная на Чарнігаўшчыне, пачувала сябе літвінкай. Дзмітро займеў на сучаснай літоўскай зямлі многа творчых пабрацімаў, супрацоўнічае з літоўскай дыяспарай. Таму і мае за заслугі перад Літвой Рыцарскі крыж. Сёлетні год для Дзмітра закончыцца з цёплым шаляценнем: споўніцца семдзесят сем гадочкаў з дня нараджэння.**

**Дажывём і да юбілею. А пакуль — на прадаўжэнне творчай дружбы і ўзаемаперакладчыцкай працы — мой узгалосак з Кіева: на падтрымку ўзбалелага сэрца Дзмітра.**

**Сяргей ПАНІЗЬНІК.**

**Дзмітро ЧАРАДНІЧЭНКА** *(Кіеў)*

### БУДЗЬ РАДЫ!

*Пакуль не ўпаў асенні ліст*
*На нашы берагі,*
*Пакуль гарыць прамень тугі*
*Насуперак змярканню,—*
*Будзь рады сонцу і жыццю,*
*І нашаму каханню.*

*Хай наўскасяк нясе буран*
*Віхрастыя кругі,*
*А каб не здрадзілі лугі*
*Праменістаму званню,—*
*Будзь рады сонцу і жыццю,*
*І нашаму каханню.*

*Змаркоціцца настрой*
*душы,*
*Пачуцці — на разлёт...*
*Збавеннем*
*пацалункаў мёд,—*
*Натхненне спадзяванню.*
*Мы рады сонцу і жыццю,*
*І нашаму каханню!*

### А ЧЫЙ ТЫ СЫН?

*Ты поўны дабрыні,*
*Адкрыты і лагодны,*
*Ты — ласкаю —*
*І мора зморыш.*
*І ўсё ж дазволь хоць раз*
*пачуць,*
*А як з матуляю гаворыш.*

*Памкненні гордыя ў цябе,*
*І мэта ў цябе ёсць:*
*Ты ёю шлях свой зорыш...*
*І ўсё ж дазволь хоць раз*
*пачуць,*
*А як з матуляю гаворыш.*

*Ты ў пахвальбе герой:*
*Захочаш — спыніш плынь,*
*А скалам сінь падорыш...*
*Але адно пачуць*
*дазволь, —*
*Як з роднай мамачкай*
*гаворыш.*

**Пераклаў з украінскай мовы Сяргей ПАНІЗЬНІК.**

■ Асоба

# Іван ЧАРОТА: «КАЛІ НЕХТА КАЖА, ШТО ЁН СВАБОДНА ВАЛОДАЕ МНОГІМІ МОВАМІ, ЁН ПАДМАНВАЕ — ЦІ ТОЛЬКІ НАС, ЦІ НАВАТ І САМОГА СЯБЕ...»

**Цудоўна размаўляе на роднай мове. Звяртаешся па-руску — гэтак жа і адказвае. Валодаючы большасцю славянскіх моў, гаворыць звычайна з сербамі — па-сербску, з балгарамі — па-балгарску... І з кожным знаходзіць мову агульную — у прамым сэнсе!**

**Іван Аляксеевіч Чарота — доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Сербскай Акадэміі навук і мастацтваў, акадэмік Міжнароднай Славянскай Акадэміі навук, адукацыі, мастацтва і культуры, загадчык кафедры славянскіх літаратур БДУ. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама Расіі і Сербіі. Займаецца літаратуразнаўствам, крытыкай, перакладам з сербскай, славенскай, македонскай, польскай і іншых моў на беларускую і рускую, а таксама з беларускай на сербскую. Яго наробак — больш за 1000 друкаваных перакладаў, у тым ліку звыш 60 кніжных выданняў. Ён — заснавальнік, укладальнік і перакладчык серыі «Сербскае багаслоўе XX стагоддзя», у якой ужо выйшла два дзясяткі кніг.**

**Лаўрэат міжнароднай прэміі імя Астрожскага, прэміі Саюза пісьменнікаў Сербіі, уладальнік памятнага медаля Саюза славацкіх пісьменнікаў і Залатога знака Культурна-асветнага таварыства Сербіі, кавалер ордэнаў прападобнага Сергія Раданежскага і святога Савы Сербскага. А сёлета атрымаў яшчэ адну ўзнагароду.**

**Гэта Міжнародная літаратурная прэмія імя Ф. М. Дастаеўскага (Сербія), якая была прысуджана Івану Чароту яшчэ ў 2007 годзе, а ўручылі яе толькі цяпер. Праўда, атрымаў яе беларускі філолаг і літаратар у «падвойным фармаце»: камітэт па прэміі прыняў рашэнне перадаць лаўрэату-беларусу яшчэ і дыплом Патрыярха Сербскага Паўла, які быў наступным лаўрэатам, але не дажыў да моманту ўручэння. А паколькі Іван Чарота яшчэ пры жыцці патрыярха пераклаў на рускую мову дзве яго кнігі (адну з іх пры яго жыцці, а другую адразу пасля спачыну), то вырашылі, што справядліва будзе дыплом, прызначаны Яго Свяцейшаству, перадаць на памяць папулярызатару яго духоўнай спадчыны.**



***— Прэмію імя Дастаеўскага вы атрымалі за «Анталогію беларускай паэзіі» для сербаў? Скажыце шчыра, Іван Аляксеевіч, ці лёгкі быў шлях да зорак?***

— Уласна, прэміяй мяне ўшанавалі задоўга да згаданай Вамі «Анталогіі», якая ўбачыла свет толькі што. Ды гэта ўжо другое выданне. Першае з'явілася ў 1993 годзе. А яго шлях да чытача быў няпросты.

Справа ў тым, што беларуска-сербскія літаратурныя сувязі доўгі час не мелі ніякай сістэмнасці. З абодвух бакоў з'яўляліся толькі асобныя пераклады, прычым спарадычныя, абумоўленыя пераважна выпадковасцямі. І калі я мусіў уключыцца ў гэты працэс, адчувалася вялікая патрэба прывесці ўсё хоць у нейкі парадак, каб як з аднаго, так і з другога боку ўяўленні чытачоў пра роднасныя літаратуры набліжаліся да аб'ектыўнасці, хоць бы панарамнасці. На пачатку 1980-х гадоў з'явіўся ў мяне сербскі партнёр — выдавец і паэт Момчыла Джэркавіч. Мы дамовіліся на парытэтных пачатках рыхтаваць «Анталогіі» паэзіі XX стагоддзя — сербскай для Беларусі і беларускай для Сербіі. У нас такое выданне выйшла ў 1989 годзе. А вось «парытэт» ніяк не мог з'явіцца. Тады я вымушаны быў скласці дадатковы, «запасны» варыянт, у іншай задуме — каб увайшла паэзія ад старажытнасці да сучаснасці. Ужо асвоіўшыся ў сербскім асяроддзі, я знайшоў выдатнага перакладчыка — прафесара Міадрага Сібінавіча, а затым дамовіўся з бялградскім выдавецтвам «Навуковая кніга».

Ды пачаўся «развал Югаславіі». Адпаведныя падзеі выклікалі інфляцыю, і «Навуковай кнізе» такі праект аказаўся не па сілах. Дзякуючы некаторым маім сябрам і прыхільнікам беларушчыны (у іх ліку згаданы прафесар Сібінавіч, Міларад Блэчыч, Міларад Джурыч) да выпуску кнігі далучылася высокакваліфікаваная «Сербскае літаратурнае таварыства» як сувыдавец. А ў сувязі з гэтым яшчэ мушу адзначыць надзвычай кранальны момант: спонсарскую падтрымку беларускай «Анталогіі» тады — калі Сербія знаходзілася ў жорсткай палітычнай і эканамічнай блакадзе! — прапанавала тэкстыльнае прадпрыемства «Явар» з косаўскага горада Іваніца... Гэта сапраўды братэрскі жэст! Вось так беларуская анталогія выйшла, прычым у выдатным афармленні. Яна была заўважана і літаратурнымі крытыкамі, і даследчыкамі, і чытачамі-аматарамі паэзіі.

З другім выданнем «Анталогіі» для мяне ўсё было прасцей. Ініцыятарам яго стаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Сербія — Уладзімір Мікалаевіч Чушаў. Ён сам, дарэчы, і спонсара знайшоў. Гэта пан Драгалюб Швоня, генеральны дырэктэр фірмы «Беларусь-Аграпанонка».

***— У чым адметнасці другога выдання анталогіі?***

— Галоўная адметнасць у тым, што гэтае выданне асветлена юбілеямі — яно і пазначана як прысвечанае 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. А мы ўлічвалі таксама і 100-годдзе Максіма Танка, і 120-годдзе Максіма Багдановіча, якое адзначалася летась. Дадаткова трымалася пад увагаю, што сёлета для Беларусі — Год кнігі. Адпаведна, калі першая «Анталогія» змяшчала па два вершы кожнага паэта, то ў цяперашнім выданні Купала, Колас, Багдановіч і Танк прадстаўлены грунтоўна. Увогуле ж аб'ём другога выдання павялічыўся амаль у два разы. Цяпер «Анталогія» пачынаецца з Кірылы Тураўскага і ахоплівае панараму развіцця беларускай паэзіі да самага апошняга часу. Прычым з першай версіі мы не выкінулі ніводнага твора!

***— Вы маглі б стаць не толькі складальнікам анталогіі, але і яе перакладчыкам. Сербская мова, як кажуць, ваш канёк...***

— Гэта неабавязкова. Акрамя ўсяго, так задумвалася ад пачатку. Ведаеце, у прынцыпе, паэзія неперакладальная. Проста немагчыма на іншай мове перадаць усе нюансы, якія ёсць у арыгінале і ўспрымаюцца носьбітам мовы арыгінала. Так што праца перакладчыка паэзіі вельмі складаная, тонкая і адказная. Але з усім гэтым абодва разы цудоўна спраўляўся высакакласны тэарэтык і практык перакладу, прафесар-славіст Міадраг Сібінавіч. Што ж да мяне, то я ніколі не перабольшваў свае магчымасці як перакладчыка на мову сербскую. Аптымальна — каб паэзію перакладалі носьбіты мовы перакладу. Як і пісаць вершы. Па вялікім рахунку, на чужой мове — гэта ўжо нешта іншае. Даводзіцца, праўда, і гэта рабіць, калі больш няма каму. Цяпер вось я рыхтую «Анталогію беларускай паэзіі» для Чарнагорыі, у якой будзе нямала і маіх перакладаў.

***— У славянскіх краінах, відаць, беларуская літаратура запатрабаваная?***

— Калі па шчырасці, вымушаны канстатаваць, што ў замежным свеце асаблівай увагі да яе няма. А каб змяніць гэты стан, патрэбна прыкладаць вялікія намаганні з нашага боку. Тут не абысціся без сур'ёзных праграм, а галоўнае — без фінансавай падтрымкі нашай дзяржавы для замежных перакладчыкаў, папулярызатараў-крытыкаў, выдаўцоў. Інакш паўнавартаснага і плённага супрацоўніцтва не будзе. Не сакрэт, як Захад ставіцца да Беларусі. Часцей за ўсё там пішуць, быццам бы гэта датычыцца толькі палітыкі. Няпраўда, у вельмі значнай ступені адбіваецца на культурных, літаратурных кантактах. Замацоўваюцца негатыўныя стэрэатыпы. А каб іх пераадольваць, паўтараю, патрэбна прыкладаць вялікія намаганні. Ёсць і яшчэ адна істотная акалічнасць, пра якую мы самі не любім гаварыць: у замежным свеце толькі каля 5 % перакладаў беларускай літаратуры ажыццяўляецца з мовы-арыгінала, а каля 95 % — з рускай, праз рускую. Ды і ў самой нашай краіне зусім не ідылічная сітуацыя з падрыхтоўкай спецыялістаў па тэорыі і практыцы менавіта мастацкага перакладу. Проста вывучаць мовы — гэтага мала...

***— Паліглотамі нараджаюцца... Гэта пра вас?***

— Калі нехта кажа, што ён свабодна валодае многімі мовамі, ён падманвае — ці толькі нас, ці нават і самога сябе... Узровень валодання мовай — гэта заўжды вельмі сур'ёзная справа. Трэба асцерагацца гэтай фармулёўкі пра свабоднае валоданне мовамі народнымі, на якіх не маеш патрэбы думаць, а тым больш — сны сніць.

***— Колькі моў ведаеце?***

— Згадваючы, якія даводзіласся вывучаць, магу назваць нямецкую і іспанскую, якімі займаўся добраахвотна і паспяхова. Пад прымусам англійскую — вывучаў разам з сынам-школьнікам, калі той пачаў прыносіць па замежнай мове двойкі. Карыстаюся ўсімі славянскімі мовамі ў рознай ступені. З блізкай частотнасцю ўжываю беларускую і рускую. Калі хто да мяне звяртаецца па-рускі — я адказваю гэтаксама, па-беларуску — адпаведна. Асяроддзем (як шырэйшым, так і вузейшым) задаецца патрэба ў той ці іншай мове. Напрыклад, мы з жонкай размаўляем таксама на сваім родным дыялекце, а наш дыялект бліжэйшы да літаратурнай украінскай мовы, чым да беларускай альбо рускай. Тонкая справа — розныя функцыі мовы.

***— Вы маглі быць, напэўна, добрым гідам-перакладчыкам...***

— З гэтага я пачынаў як сербіст. Калі вучыўся ва ўніверсітэце, падпрацоўваў гідам-перакладчыкам. Практыка, скажу вам, надзвычай карысная. А складанасцяў нямнога: вывучыў пэўныя тэмы і «пракручвай» турыстам, падарожнічаючы з імі, накормлены ды напоены, быццам ты таксама турыст... Многага там не патрабавалася. Таму гэта адназначна было не для мяне.

***— Ці праўда, што гаварыць на некалькіх мовах вы пачалі амаль з дзяцінства?***

— Не гаварыць, а чытаць. Гэта абумоўлена моўнай сітуацыяй майго краю і ўласна роднай вёскі Лышчыкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Гэта на памежжы і з Польшчай, і з Украінай. Паколькі ўлада там неаднойчы мянялася, то рознымі былі і дзяржаўныя мовы. А я ўжо як бы «сінтэзаваў» гістарычна-лінгвістычны вопыт майго роду: адначасова пачаў чытаць польскі буквар, ні ў Варшаўскі Дагавор, ні ў Савет Эканамічнай Узаемадапамогі — адным словам, выпадала з «сацыялістычнага лагера». Югаславія на той час мела вышэйшы за ўсе іншыя сацыялістычныя краіны ўзровень жыцця. Ды, вядома ж, не гэта мяне цягнула: я не палітык і не эканаміст. А вось мова, літаратура, культура гэтай братняй краіны цікавілі моцна! І цяпер нікольні не шкадую, што ўсё жыццё займаюся югаславістыкай, перш за ўсё — сербістыкай. Даўно ўжо маю падставы жартам называць сябе «беласербам» (*смяецца*).

***— Вы адзін з тых нямногіх пісьменнікаў, якія засяроджаны на праблемах духоўнасці. Як да гэтага прыйшлі?***

— Таксама пытанне складанае. З аднаго боку, я народжаны і выхаваны ў асяроддзі, якое веру ў Бога не страчвала ніколі. Іншая справа, што «дух часу» майму пакаленню не спрыяў падтрымцы веры продкаў. Аднак «дарога да храма» была мне знаёмай здаўна. А па-сапраўднаму я вяртаўся да Царквы зноў жа праз Сербію, у 1980-я гады. Паступова, ужо ў 1990-я, далучыўся таксама да царкоўнага пісьменства, літаратуры духоўнай, а затым і ўласна багаслоўскай. Сербскае багаслоўе XX стагоддзя — фенаменальная з'ява. Я з вялікім захапленнем чытаю і перакладаю падобныя творы. У маім перакладзе ўжо выйшла нямала кніг сербскіх багасловаў.

***— Каб пранікнуцца багаслоўем, трэба быць чалавекам веруючым...***

— Безумоўна! Ды я лічу, што ўсе людзі — веруючыя. Толькі адны прымаюць веру свядома, іншыя — несвядома. А няверуючых людзей увогуле не існуе!

***— Іван Аляксеевіч, што выкладаеце на філфаку?***

— Маю прафесію можна было б называць так, як калісьці пісалі ў пасведчаннях выпускнікоў сельскіх прафесійна-тэхнічных вучылішчаў: «Трактарыст-машыніст шырокага профілю» (жартуе). Каб забяспечыць розныя аспекты спецыяльнасці «Сербістыка», чытаю ўсе літаратуразнаўчыя і культуразнаўчыя курсы, ахопліваючы храналогію ад старажытнасці да сучаснасці. Акрамя гэтага, больш за 20 гадоў выкладаю тэорыю і практыку перакладу. У залежнасці ад зацікаўленасці студэнтаў прапаноўваю спецыяльныя курсы.

***— Як знаходзіце паразуменне з моладдзю?***

— Моладзь мяняецца. Ці лягчэй цяпер працаваць у параўнанні з былымі гадамі? Не. Многія цяперашнія студэнты не вучыцца прыходзяць. Уся атмасфера ў іх духоўным і культурным жыцці змяняецца да горшага. Таму маса, у цэлым, пакідае не самыя лепшыя ўражанні. Але, як і ва ўсе часы, асобныя маладыя людзі вылучаюцца дапытлівасцю. З такімі студэнтамі мець зносіны карысна, паколькі яны яшчэ не заражаны стэрэатыпамі. Я ж не люблю чытаць лекцыі з паперак, а вяду, калі магу, свабодныя гаворкі, мэта якіх — сумесны пошук адказаў на пытанні. Бо гатовыя адказы — гэта, часцей за ўсё, зноў-такі падман альбо самападман. Лекцыя для мяне — гэта роздум, зварот да студэнтаў як да суразмоўцаў і «сураздумнікаў».

***— Амаль у кожнай сваёй кнізе вы прытрымліваецеся адной лініі — славянскага адзінства...***

— Так, і часта паўтараю: славянскі свет цяпер — 15 самастойных краін, каля 350 мільёнаў насельніцтва... Калі ж узяць яшчэ славянскія дыяспары, а таксама тых, хто па прычынах кан'юнктурных не індыфікуе сябе правільна, то славян набярэцца палова мільярда. Прычым тэрыторыі, якую засяляюць яны, — не проста шостая частка сушы, а найбагацейшая! Да таго ж якая за славянамі стаіць культура! Хто можа супрацьстаяць такому суперэтнасу? Аднак чамусьці адзінства няма. Нягледзячы ні на што, я хачу, каб яно было. І не адзін я, такіх многа ёсць, і яны ва ўсе часы былі. Гэта не толькі рамантычная ідэя — яна абсалютна прыдатная для рэалізацыі. Вядома, у свеце нямала тых, каму такая перспектыва не падабаецца, і яны прыкладаюць усе намаганні, каб адзінства славян парушыць. Няма чаго граху таіць, парушаюць. Ды калі адзін «рус» ідзе супраць другога «руса» — гора славянам, якія забываюць свае карані, агульную гісторыю. Вось чаму для мяне вельмі дарагой і значнай застаецца ідэя славянскай супольнасці, узаемнасці. І я гатовы да канца жыцця працаваць з усяе сілы, каб гэтая ідэя рэалізавалася. Таму і працую шчыра, з радасцю. Але... без асаблівай карыслівасці.

**Гутарку вяла Вераніка КАНЮТА** ■

# ВІЛЬНЮС: ШТО МЫ ПРА ЯГО ВЕДАЕМ?

**Калі ўязджаеш у Вільнюс з боку Беларусі — то шлях нібыта сам вядзе да гэтай брамы, якая стала сімвалам горада. Толькі бачыш яе — і адразу адчуваеш прыцягненне ад розных інтрыгуючых сімвалаў, знакаў гісторыі, абрысаў мінуўшчыны. За гэтай брамай хаваюцца стагоддзі, за ёй тое, што хочацца спасцігнуць і зразумець. За ёй штосьці святое...**

Гэта адчувае кожны чалавек, дзе б ён ні жыў і адкуль бы ні прыехаў у Вільнюс: стары горад нездарма ўнесены ў Спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Але беларусы, шпацыруючы па Вільнюсе, атрымаюць не толькі наталенне рознымі архітэктурнымі стылямі...

— Вільнюс — горад, па якім можна вывучаць гісторыю нашай краіны, бо тут шмат месцаў, звязаных з выдатнымі асобамі. Шмат магчымасцяў пабачыцца з Беларуссю часоў Сярэднявечча і нашых дзён, — гаворыць **пасол Беларусі ў Літве Уладзімір ДРАЖЫН**. — Але пачынаць падарожжа па Вільнюсе трэба адсюль... Гарадская брама ў гарадах Беларусі першай сустракала гасцей, магу нагадаць славутую Слуцкую браму ў Нясвіжы, дзе мне давялося працаваць. Таму прапаную пачаць наш шлях ад Вострай брамы — адзіныя гарадскія вароты, якія захаваліся ў Вільнюсе да нашага часу.

Экскурсія з Уладзімірам Дражыным пачынаецца ад Вострай брамы.

## Ад Вострай брамы

Гарадская сцяна выглядае трывала нават цяпер. Праўда, захаваўся толькі яе фрагмент з XVI стагоддзя. Але разумееш, што яна пад надзейнай аховай — вершніка з герба ВКЛ ды Ісуса Хрыста. Але далей, з адваротнага боку, бачыш сапраўдны ахоўны цуд: калі над табой адкрываецца капліца з цудадзейным абразом XVII стагоддзя Маці Божай Вастрабрамскай. Ён адразу прыцягвае — і настолькі багатым акладам, які асляпляе праз акно. Ён прыцягвае жыццём, нібыта чалавечым: побач заўсёды людзі. Зайсці і памаліцца проста — да абраза вядзе лесвіца. Хрысцяцца каталікі і праваслаўныя; літоўцы, палякі, беларусы... Абраз Маці Божай Вастрабрамскай лічыцца цудатворным, у XX стагоддзі быў двойчы каранаваны Папам Рымскім.

Ад храма святой Тэрэзы трошкі ўніз па вуліцы **Aušros Vartų** — царква Святога Духа і адзіны праваслаўны манастыр у Літве. Заснаваны ў 1597 годзе насупраць таго месца, дзе ў 1347-м загінулі пакутніцкай смерцю за веру Хрыстову тры беларусы з дружыны князя Альгерда — Антон, Іаан, Яўстах. Цяпер тут месца паломніцтва вернікаў: мошчы трох св. Віленскіх пакутнікаў спачываюць у манастыры. Месца іх пакарання — праз дарогу. На ім заклала першую драўляную царкву жонка князя Альгерда, а пазней пабудаваў храм Святой Тройцы Канстанцін Астрожскі (вялікі гетман ВКЛ пакінуў Вільні яшчэ Прачысценскую і Мікольскую цэрквы). На сцяне Свята-Троіцкага храма яшчэ відаць фрэска з выявамі святых. Цяпер сабор належыць уніятам.

Калісьці тут быў яшчэ базыльянскі манастыр. На пачатку XX стагоддзя былы комплекс кляштара базыльян стаў сапраўдным культурным цэнтрам беларусаў. Тут месцілася праваслаўная духоўная семінарыя, Віленская беларуская гімназія, Беларускае навуковае таварыства і Віленскі беларускі музей.

## Браты-беларусы

У 1919 годзе пачала дзейнічаць Віленская беларуская гімназія, якую арганізаваў Іван Луцкевіч. Ён жа і выкладаў у ёй разам з братам Антонам, працавалі выкладчыкамі тут Барыс Кіт, які потым стаў сусветна вядомым вучоным, апантаны музыка і збіральнік фальклору Рыгор Шырма, пісьменнік Максім Гарэцкі, пра што сведчыць мемарыяльная дошка.

Браты Луцкевічы былі натхняльнікамі многіх праектаў, важных для асобнай краіны пад назвай Беларусь. Дагэтуль ідзе слава пра Віленскі беларускі музей братоў Луцкевічаў, у калекцыі якога былі славутыя слуцкія паясы, манеты, этнаграфічныя рарытэты, рукапісныя кнігі і старадрукі. Гэты музей быў сведкам таго, што ў беларусаў ёсць свая адметная і багатая гісторыя. У 1941 годзе музей налічваў 13 450 адзінак захавання... Браты мелі дачыненне да выхаду газеты партыі Беларуская сацыялістычная грамада «Наша доля», якая стала першым дазволеным перыядычным выданнем на беларускай мове, дзе друкаваліся Цётка, Ядвігін Ш., Якуб Колас.

— У Вільнюсе многа мясцін, якія звязаныя з імёнамі братоў Луцкевічаў, — гаворыць Уладзімір Дражын. — Сёлета адзначаецца 90-годдзе заснавання Віленскага гісторыка-этнаграфічнага музея Івана Луцкевіча. Мы правялі навуковую канферэнцыю і цяпер працуем па ўзнаўленні музея. На вялікі жаль, калекцыя не захавалася, яе экспанаты аказаліся расцярушанымі па краінах, па музеях. Але ёсць сапраўдныя беларусы, якія мелі дачыненне да таго музея, памятаюць пра яго і дапамагаюць у зборы рарытэтаў. Калі мы праводзілі вясной Дні культуры Беларусі, людзі прынеслі на адкрыццё выставы шмат рэчаў, што мелі дачыненне да таго музея: яны аказаліся ў іх дома. Думаю, ёсць сэнс узнавіць музей, канцэпцыю яго распрацоўвае Міністэрства культуры.

У школе імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе мы адрамантуем каля 100 кв. м памяшкання з асобным уваходам і аддадзім пад музей імя Івана Луцкевіча.

## Міцкевіч і Alma Mater

Хадзіць ля базыльянскіх муроў без узнёсласці немагчыма: вельмі шмат беларускіх згадак і адольвае паэтычны настрой. Нездарма: у адным з будынкаў кляштара — знакамітая келья Конрада. У ёй сядзеў Адам Міцкевіч. Кляштар быў прыстасаваны пад вязніцу, куды трапілі ўдзельнікі тайных таварыстваў філаматаў і філарэтаў...

Пра паэта Адама Міцкевіча ў Вільнюсе ўзгадваць даводзіцца часта: дапамагаюць мемарыяльныя дошкі, якімі адзначаны будынкі, звязаныя з яго жыццём. Далей па Вастрабрамскай і трошкі ўбок — нельга прамінуць дом, у якім паэт жыў — пра гэта сведчыць шыльда. Падыхаць паветрам Міцкевіча ў сучасным Вільнюсе абсалютна рэальна: варта паглядзець, у якіх будынках яму даводзілася жыць, у адным з іх **(Bernardinų, 11)** цяпер музей Адама Міцкевіча, які належыць Віленскаму ўніверсітэту, дзе паэт вучыўся.

Віленскі ўніверсітэт быў асяродкам, дзе выхоўвалася эліта ВКЛ і Рэчы Паспалітай на працягу стагоддзяў — і нам ёсць кім з яго выпускнікоў ганарыцца: узгадайма яшчэ асветніка Сімяона Полацкага, паэта Яна Чачота ці вучонага Ігната Дамейку...

Сёлета 210 гадоў з дня нараджэння Дамейкі, да яго 200-годдзя ў Вільнюсе літаральна ў браме Свята-Троіцкага храма з'явілася памятная дошка ў гонар чалавека, які зрабіў унёсак у сусветную геалогію, працуючы ўжо ў Чылі. Талент, добрая адукацыя і такая беларуская рыса, як добрасумленная адданасць справе, дазволілі Дамейку атрымаць пашану ў той краіне, дзе ён апынуўся воляй лёсу і нават стаў прафесарам, рэктарам універсітэта ў Сант-яга. У той час як у роднай краіне яму было забаронена працаваць на дзяржаўнай службе — такім чынам ён быў пакараны за ўдзел у тайным таварыстве філаматаў, да якога далучаліся студэнты Віленскага ўніверсітэта.

Па вуліцы **Universiteto** можна выйсці да старых будынкаў легендарнай навучальнай установы, адной са старэйшых у Еўропе, заснаванай езуітамі яшчэ ў XVI стагоддзі, але пры клопаце Стэфана Баторыя была рэфармавана ў акадэмію, а потым стала ўніверсітэтам, які існуе па сённяшні дзень.

Старыя будынкі злучаюцца адзін з адным, адзін корпус вядзе да другога, з аднаго дворыка трапляеш у іншы. Універсітэт — гэта цэлы навучальны комплекс, сэрцам якога з'яўляецца касцёл Святога Яна, дзе захоўваецца памяць пра славутых асоб, якія пакінулі след у гісторыі і культуры не адной краіны: ёсць мемарыяльная дошка Тадэвушу Касцюшку, Адаму Міцкевічу і Уладзіславу Сыракомлі, які жыў у Вільні з 1852 года да смерці (мемарыяльная дошка на вуліцы **Barboros Radvilaites, 3**).

Паэты вельмі любілі Вільню — у розныя часы. Горад спрыяў паэзіі: яе нараджэнню і распаўсюджанню сярод людзей. Дом **№4 па вуліцы Універсітэцкай** дарагі для беларусаў увасабленнем знакавага паэтычнага зборніка — «Вянок» Максіма Багдановіча. Бо ў гэтым будынку месцілася тая самая друкарня Марціна Кухты, пра якую напісаў Багдановіч. Друкаваліся тут творы многіх беларускіх класікаў: Францыска Багушэвіча, Цёткі, Якуба Коласа...

## Першадрукар

Чаму ў Вільні квітнела справа выдання беларускіх кніг, і не толькі кніг? У розныя часы... Гэта традыцыя, аднак. Жыццядзейнасць духу асветніцтва, што напаўняў няўрымслівыя натуры нашых землякоў, якія імкнуліся даць людзям магчымасць удасканаліць сябе і сваё жыццё. Гэты дух і цяпер жывы. У самым сэрцы горада, калі выйсці на Ратушную плошчу, не складана знайсці славуты дом Бабіча XV-XVI стагоддяў **(Didzioji, 19)**. Але не самі стагоддзі і не імя гаспадара — бурмістра горада — робяць яго прыцягальным для нас. У 1520 годзе ў Вільню з Прагі перавёз сваю друкарню Францыск Скарына! Пра гэта сведчыць мемарыяльная дошка з барэльефам першадрукара. Але Уладзімір Дражын прапануе прайсці ў глыб дворыка:

— Вось будынак, які сёння можна было б прыстасаваць пад друкарню: абмяркоўваецца пытанне наконт таго, што нам могуць даць яго ў арэнду. Можна было б сапраўды тут паставіць абсталяванне і дэманстраваць, як друкаваліся кнігі, а можна выкарыстоўваць памяшканне дзеля культурных праектаў, тым больш што праз 5 гадоў мы будзем адзначаць 500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Непадалёк ад мемарыяльнай дошкі стаіць невялічкі помнік першадрукару. Але гэта хутчэй збіральны вобраз. Хацелася б адзначыць асобным помнікам менавіта самога Францыска Скарыну — мы працуем над тым, каб дазволілі ўсталяваць яго ў Старым горадзе. Ёсць цудоўнае месца, дзе рака Вілейка ўпадае ў Вілію. За мастком ля гэтай рачулкі пачынаецца вуліца Полацкая, якая падвойваецца. На гэтым падваенні ёсць сквер. Было б прыгожа і лагічна: Францыск Скарына ідзе з Полацка і ў руцэ трымае кніжку...

Іду і думаю: у асоб, якія былі захоплены творчасцю, служэннем ідэі, рэдка ў каго быў просты лёс: нястач, пераследаў — усяго хапала. Затое ўдзячнасці ад нашчадкаў — не на адно стагоддзе. Проста творчасць — напэўна, як нейкі касмічны вірус, — здольная выжываць і фарміраваць імунітэт для выжывання народа, у кроў якога пранікае. Адпаведна робіць яго мацнейшым нават у тыя перыяды, калі для самапавагі, здаецца, няма ўмоў.

## Ад беларускіх гукаў і слоў — да беларускіх думак

Ратушная плошча нагадала яшчэ пра Станіслава Манюшку. У XIX стагоддзі будынак ратушы аддалі тэатру. У тэатры адбылася прэм'ера канцэртнага варыянта оперы Станіслава Манюшкі «Галька» — 1 студзеня 1848 года. Гэта быў вялікі поспех аўтара, які ўклаў у оперу свае патаемныя думкі пра народ, дзеля якога хацеў працаваць. Манюшка вельмі паважліва ставіўся да беларускага фальклору і выкарыстоўваў яго ў творчасці, ён быў першы, хто ўвёў у оперную музыку беларускую мову, — і гэта ў часы Мікалая I, калі не павінна было быць ніякіх напамінаў пра асобны шлях і культуру радзімы кампазітара.

Але ён насіў яе ў сабе, абмалёўваў гукамі. У Вільні Манюшка жыў з 1840 года, пасля таго, як ажаніўся, — 18 гадоў. Чаго дзівіцца, што напамінаў пра яго ў горадзе шмат: бюст ля касцёла святой Кацярыны на **Vilniaus, 30**, дошка на доме, дзе жыў, па вуліцы **Vokiečių, 26**. Бюст кампазітару ёсць у вядомым нам ужо касцёле святога Яна. Ён тут працаваў арганістам. І стваряў. А потым стаў яшчэ і дырыжыраваць оперными спектаклямі ў Віленскім тэатры. Ён рабіў справу, а не кар'еру. Але дасягнуў вяршыняў: праз 10 гадоў пасля віленскай адбылася прэм'ера ўдасканаленай «Галькі» ў Варшаўскім тэатры, пасля чаго яму прапанавалі пасаду мастацкага кіраўніка гэтага тэатра. Манюшку назвалі заснавальнікам польскай нацыянальнай оперы. А мы можам называць — і беларускай: не толькі па нараджэнні ва Убелі і вучобе ў Мінску — па сутнасці творчага выбару.

Свой выбар зрабіў і Францішак Багушэвіч, аўтар «Дудкі беларускай». У Вільню ён пераехаў у 1884 годзе і менавіта тут стаў актыўна

Ля дома, дзе жыў і працаваў Я. Купала.

пісаць. Бацьку беларускай літаратуры ў Вільнюсе трэба было ўшанаваць асабліва — так і ёсць...

— Мемарыяльная дошка Францішку Багушэвічу адметная. Звярніце ўвагу: тэкст ідзе спачатку па-беларуску, а потым па-літоўску, — падкрэслівае Уладзімір Несцяровіч. — Дом, дзе жыў Багушэвіч, у гады апошняй вайны разбурылі. У 2010-м мы ўсталявалі дошку у знак юбілею Багушэвіча на будынку побач: **Arklių, 18C.** Ён належыць каталіцкай царкве, нам удалося дамовіцца. Атрымаўся цудоўны вынік і магчымасць прыйсці, пакланіцца чалавеку, які шмат зрабіў для гісторыі Беларусі і Літвы.

Багушэвіч працаваў адвакатам, абараняючы самых бяспраўных. Калі ісці па **Pylimo** да скрыжавання з **Trakų**, то абавязкова прыцягне ўвагу будынак з магутнымі атлантамі — у часы Багушэвіча тут была судовая палата.

Але гэты адметны будынак за пяць стагоддзяў існавання наскрозь прасякнуты беларускім духам. Па-першае, гэта палац Тышкевічаў, тых самых, што захапляліся археалогіяй і лічацца аднымі з пачынальнікаў беларускай музейнай справы. Яшчэ ў гэтых сценах збіраліся паплечнікі Каліноўскага. А на пачатку XX стагоддзя гэта быў адзін з адрасоў газеты «Наша ніва», якая падхапіла беларускамоўную справу «Нашай долі» і здолела аб'яднаць лепшыя сілы тагачаснай беларускай інтэлігенцыі, што марыла пра Беларусь: Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Янку Купалу, Вацлава Ластоўскага...

За адзін год — 1907 — рэдакцыя змяніла некалькі адрасоў нават на адной вуліцы. Некаторыя з іх адзначаны — праз выдатных асоб беларускай культуры. Мемарыяльнай дошкай пазначаны будынак, дзе жыў гісторык Вацлаў Ластоўскі, які быў сакратаром «Нашай нівы» (на скрыжаванні **Pylimo** і **K.Kalinausko**).

Але асабліва прыцягвае сёлета апошні год існавання рэдакцыі (1914-1915) і адрас: **Vilniaus, 14**.

— Янка Купала жыў у гэтым доме ў нашаніўскі перыяд, калі быў рэдактарам газеты, — гаворыць пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын. — Цяпер перад намі стаіць задача аднавіць мемарыяльныя дошкі Янку Купалу і Якубу Коласу: яны павінны быць годнымі. Гэта важна — таму што памятныя знакі сёння з'яўляюцца сведчаннем нашай багатай культуры і прысутнасці Беларусі ў Еўропе.

Асабліва актыўна памятныя дошкі пра беларускіх выдатных асоб сталі з'яўляцца ў Вільнюсе ў першай палове 90-х гадоў XX стагоддзя. Памятныя знакі ўсталяваны ў месцах, звязаных з жыццём і дзейнасцю Янкі Купалы, Рыгора Шырмы, Браніслава Тарашкевіча, які на пачатку 1920-х гадоў жыў па вуліцы Віленскай...

## Змагар

— У нас яшчэ шмат спраў па ўшанаванні памяці нашых выдатных асоб. Але найбольш важна разам з думкамі пра помнік Скарыну паклапаціцца і пра помнік Кастусю Каліноўскаму. Помнік абавязкова павінен з'явіцца, а месца мы зараз угадняем з літоўскім бокам, — запэўнівае пасол.

Гэты горад быў для Каліноўскага месцам веры ў людзей: на кватэры Ямантаў ён сустракаўся і абмяркоўваў з аднадумцамі магчымасці паўстання. Горад быў для яго месцам збору і рэвізіі сіл для барацьбы за гістарычную справядлівасць. Для нас стаў горадам, дзе жыве памяць пра героя: у доме ля касцёла свято-

Памятная дошка Кастусю Каліноўскаму.

га Яна ён хаваўся і быў арыштаваны, дошка ля кляштара дамініканцаў на вуліцы **Svento Ignoto, 11** нагадае пра Каліноўскага-вязня. Служкі царскай улады ўчынілі паказальную расправу з нязгоднымі паўстанцамі, адправіўшы Каліноўскага на смерць. Але нягледзячы на тое, што нас імкнуліся пазбавіць памяці пра героя, памяць чалавечая аказалася мацнейшай: на Лукішскай плошчы, дзе Каліноўскі быў пакараны, стаіць крыж і ляжыць пліта. Імкнуліся выкрасліць назаўсёды імя Каліноўскага і тым, каб месца яго пахавання было невядомае нашчадкам. Але цяпер гэты факт сведчыць толькі пра тое, што сапраўдныя героі небяспечныя нават пасля смерці. І чым больш гісторыя захоўвае пра іх таямніц, тым больш гучныя іх імёны...

## Ля Замкавай гары

У памяць пра тых, хто прайшоў шлях хрысціянскага пакутніцтва, паўсталі над горадам тры белыя крыжы — іх відаць здалёк. Як і славутую чырвоную вежу Гедыміна, што ўзвышаецца над Замкавай гарой. Легенда сцвярджае: тут князь Гедымін вырашыў закласці горад: пасля таго, як стаміўшыся на паляванні, сасніў жалезнага ваўка, які моцна выў. Князю патлумачылі: калі пабудаваць тут горад, то ён будзе непрыступны, а слава яго разнясецца па ўсім свеце. Назву гораду дала рака Вільня.

Чырвоная вежа сёння нагадвае, што калісьці тут быў стары замак, мураваныя сцены якога паўсталі ў першай палове XIV стагоддзя і перабудаваны ў пачатку XV стагоддзя на загад Вітаўта пасля пажару. Калі глядзець з вежы Гедыміна на горад — ён нібыта на далоні. Адчуваеш, колькі любові было ўкладзена ў яго развіццё. Крыжы, якія ўзвышаюцца па-над храмамі, сведчаць пра веру, якая жывіла яго жыхароў.

Самы значны храм Вялікага Княства Літоўскага быў закладзены яшчэ Ягайлам і Вітаўтам у 1387 годзе — Кафедральны са-

На Кафедральнай плошчы.

бор (на Кафедральнай плошчы). У гэтым саборы каранавалі вялікіх князёў, напрыклад, Вітаўта. Храм не раз аднаўлялі і перабудоўвалі, мяняліся яго архітэктурныя абрысы, да нашага часу ён дайшоў у стылі класіцызму. У сутарэннях сабора знайшлі вечны спачын вялікі князь літоўскі і кароль польскі Аляксандр Ягелон, а таксама славутая Барбара Радзівіл, якая была жонкай караля Польшчы Жыгімонта Аўгуста.

Побач з Кафедральным саборам ля Замкавай гары ў апошняе дзесяцігоддзе адбудоўваўся Ніжні замак, які быў рэзідэнцыяй князёў амаль да канца XVII стагоддзя, калі горад занялі войскі расійскага цара Аляксея Міхайлавіча. Будынак палаца быў знішчаны. Ужо ў незалежнай Літве яго вырашылі адбудоўваць практычна з нуля як важны сімвал старажытнасці дзяржавы. Зрэшты, ля Кафедральнай плошчы пра гісторыю дзяржавы і яе асоб вельмі шмат напамінаў-помнікаў: ад легендарных Міндоўга і Гедыміна.

## Паветра гісторыі

Гісторыя ў Вільнюсе — на кожным кроку. Ёю дыхаеш і незаўважна для сябе адчуваеш, што знаходзішся па-за часам: дзе сыходзяцца эпохі, падзеі, імёны, стылі. Тут прыгожае віленскае барока можа суседнічаць з рэнесансам і готыкай. Напрыклад, ёсць у Вільнюсе цудоўны гатычны храм з чырвонай цэглы, які, кажуць, уразіў нават Напалеона: касцёл Святой Ганны (XV ст.) на **Maironio, 8.**

Але калі трапіць на адну з самых старажытных вуліц Вільнюса — **Pilies** (Замкавую), то адчуе сябе часткай горада нават той, хто першы раз наведаў яго. І тут разумееш, што старажытнасць яго не музейна-выставачная, а жывая: людзей на Пілес заўсёды шмат. Гэта вуліца для прыемнага шпацыру ў неназойлівым павольным рытме — падсвядома на яго накладваеш гукі паланеза «Развітанне з радзімай». Але можна любіць Беларусь і ў Літве...

Ну як не любіць?.. Калі бачыш прыгожыя дамы-палацы, якія калісьці належалі беларускім сем'ям — Пацам, Завішам, Тышкевічам, Хадкевічам, Тызенгаўзам. На вуліцы **Dominikonų** жыў калісьці Міхал Клеафас Агінскі. А на цяперашняй **Vilnaus** некалі стаяў рэнесансны палац Радзівілаў... Палац Сапегаў наогул знайсці вельмі проста: **Sapiegos, 3**. Сядзіба (XV—XVI стст.) канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі захавалася да нашых дзён. Аўтар першай еўрапейскай канстытуцыі, складзенай у XVI стагоддзі на беларускай мове, быў віленскім ваяводам. Ён заклаў касцёл святога Архангела Міхаіла **(Šv. Mikolo, 9).** Побач з галоўным алтаром — надмагільны помнік Льву Сапегу, а сам ён спачывае ў крыпце сабора.

У мінулым стагоддзі месцам спачыну многіх выдатных сыноў Беларусі сталі могілкі Росы. Памяць пра іх жыве ў Вільнюсе. Вядома, на кожны будынак, з якім звязаныя нашы выдатныя творцы, адметныя ці драматычныя падзеі, не павесіш памятную дошку. Галоўнае: сам горад адзначаны іх увагай, ён іх прыцягваў магчымасцямі рэалізавацца, ствараць і рабіць добрую справу для радзімы. Тое, што некаторыя мясціны і будынкі Вільнюса пазначаны беларускімі памятнымі дошкамі — даніна нашай павазе не толькі ім, але і гораду, які быў прыстанкам іх мар і надзей.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
**Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА, Ларысы ЦІМОШЫК.**

*Вільнюс — Мінск.*

На старажытнай вул. Пілес.

Будынак былой друкарні Марціна Кухты.

# ВІЦЕБСК. КАЗІМІР. МАРК

**Хутка ў цэнтры Віцебска з'явяцца плакаты кшталту «Цэп, сякера й молат — багі рэвалюцыі». Але не палохайцеся, гэта толькі кіно!**

Акурат зараз у самым цэнтры Віцебска, недалёка ад плошчы Перамогі, будуецца яўрэйскі кварталычык. На жаль, праіснуе ён нядоўга. Дзесьці ў канцы верасня яго спаляць. Таму што фінал стужкі «Міракль пра Шагала», якую ў Віцебску будзе здымаць расійскі рэжысёр Аляксандр Міта, заканчваецца вялікім гарадскім пажарам.

А вось вуліцы старога горада давядзецца цалкам засыпаць пяском, каб схаваць брукаванку і асфальт. Пластыкавыя вокны і іншыя прыкметы сучаснасці замаскіруюць разнастайнымі шыльдамі і плакатамі з камуністычнымі лозунгамі. Не забывайце, што ў 1918 годзе, калі ў Віцебску адзначалі першую гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі, менавіта Марк Шагал, які знаходзіўся тады на пасадзе камісара па справах мастацтва, займаўся афармленнем горада да свята. Захаваліся дакументальныя кадры кінахронікі тых часоў, па якіх можна зразумець, як прыблізна выглядаў горад і што людзі тады думалі пра рэвалюцыю зусім не тое, што атрымалася ў выніку.

— Была абсалютная каша ў галовах, — распавядае **мастак-пастаноўшчык фільма, масквіч Эдуард ГАЛКІН**. — Неразуменне таго, што адбываецца. Рэвалюцыйныя святы нагадвалі хрэсны ход, а транспаранты і сцягі — царкоўныя харугвы. Людзі звязвалі з гэтай стыхіяй усё самае лепшае і шчырае. І гэта працягвалася першыя некалькі гадоў, пакуль не з'явілася трывалая сімволіка. Мы ў стужцы пастараемся перадаць гэта. У сцэнарыі ёсць эпізод нейкага ўмоўнага рэвалюцыйнага свята.

Стваральнікі фільма, каб надаць Віцебску абсалютную атмасферу стагадовай даўніны (дзеянне фільма адбываецца пераважна ў перыяд з 1914 па 1919 г.),па макеце скульптара Якерсона рэканструююць нават двухметровы помнік Карлу Марксу, які ў свой час так і не быў завершаны і ўсталяваны. У фільме будзе якраз сцэна ўсталявання скульптуры ў горадзе.

— Сёння Віцебск зусім не той, — гаворыць **Уладзімір ВАСІЛЕВІЧ, дырэктар здымачнай групы**. — Недзе ў Расіі можна было знайсці горад і больш падобны на шагалаўскі. Які-небудзь Таржок. Але рэальная атмасфера нам даражэй.

У Расіі, дарэчы, таксама будуць праходзіць здымкі «Міракля пра Шагала». У кастрычніку ў Санкт-Пецярбургу плануецца зняць інтэр'ерныя і звязаныя з транспартам сцэны. Потым — мантаж і агучка ў Маскве. Так што на экраны фільм выйдзе, хутчэй за ўсё, у наступным годзе.

— Праца над сцэнарыем карціны «Міракль пра Шагала», якая першапачаткова, дарэчы, называлася «Камісар Шагал і грамадзянін Малевіч», пачалася паўтара года таму, — распавядае Уладзімір Васілевіч. — Тады Міта, які сам няблага малюе, вырашыў рабіць фільм пра Шагала. Пачаў пісаць сцэнарый. Яго кансультантам стала Валянціна Кірылава — віцебскі спецыяліст па Шагале. Яна і цяпер дапамагае нам у працы.

Калі я пабачыла тое, што ў хуткім часе стане шагалаўскім Віцебскам, то адначасова і крыўда, і гонар апанавалі мяне. З гонарам усё ясна: ух, Шагал — наш! пра яго кіно здымаюць! Ну і розныя іншыя выклічнікі. А крыўдна стала таму, што праект — цалкам расійскі (тут таксама — розныя выклічнікі). Вытворчая кампанія — «Мармот-фільм», якая належыць расійскаму рэжысёру Валерыю Тадароўскаму. Ён, дарэчы, стужку і прадзюсіруе. Калі ўжо беларусы пачнуць здымаць якасныя фільмы-біяграфіі (біяпікі) пра тых, пра каго мы проста не можам не зняць: Каліноўскага, Багдановіча, Быкава, Шагала!..

А вось масоўка дакладна будзе беларуская. Магчыма, невялікія ролі з рэплікамі атрымаюць і акцёры віцебскага Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Кастынг, у любым разе, яшчэ працягваецца. І пакуль невядома, хто будзе выконваць нават галоўныя ролі — Марка Шагала і Казіміра Малевіча. На ролю Шагала, дарэчы, планавалі Антона Шагіна — Мэлса са стужкі «Стылягі». Але не склалася.

Галоўным беларускім элементам, безумоўна, стане Віцебск. У сцэнарыі назва горада паўтараецца бадай на кожнай 3-5-й старонцы. У гэтым ёсць нешта ад дабрачыннага продакт-плэйсменту (прыём схаванай рэкламы), які ў кіно заўжды быў вельмі распаўсюджаны. Магчыма, пасля гэтай, хоць і расійскай, стужкі ўсе дакладна запомняць, што Віцебск — горад Марка Шагала. І гэта беларускі горад. Магчыма, айчыннаму кінематографу трэба ўзяць гэткую рэкламу на заметку. Праўда, сэнс яна будзе мець толькі ў выпадку, калі беларускую стужку пабачаць шмат дзе ў свеце. А гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

## ЗЕРНЕ З... ДРУЗАМ

**Супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці пры маніторынгу ходу ўборкі ўраджаю ў сельскагаспадарчых арганізацыях знайшлі шмат парушэнняў у гаспадарках Сенненскага раёна.**

Было высветлена, што ў ААТ «Белая ліпа» пры спрыяльных умовах надвор'я, збожжаўборачныя камбайны знаходзіліся на тэрыторыі механізаванага двара, уборка збожжавых культур не вялася. Акрамя таго, высветлілася, што збожжа, якое часова захоўваецца тут жа, на асфальтаванай пляцоўцы, пры яго пагрузцы ў аўтатранспарт часткова змешвалася з друзам. І каму патрэбна потым такое зерне? Такім чынам было сапсавана каля двух цэнтнераў збожжа. Кантралёры таксама ўбачылі, што пры транспартаванні аўтамабілем «ГАЗ-53» з тэрыторыі механізаванага двара на збожжаток зерне не ўкрывалася покрывам, у сувязі з чым на паваротах дарогі рассыпалася.

У ААТ «Сінягорскае» на момант наведвання кантралёрамі ва ўрочышчы «Новае сяло» на плошчы 80 га пяццю збожжаўборачнымі камбайнамі вялася ўборка ячменю. Пры правядзенні ўборкі дапускаліся страты збожжа ў выглядзе непрыбранага палеглага зерня, не сабраных каласоў па краі поля і не зрэзаных каласоў у месцах, дзе пры правядзенні сяўбы не была выраўнавана глеба. Устаноўлена таксама, што атрыманы з рамонту цеплагенератар для польскай сушылкі быў некамплектны (адсутнічала паліўная фарсунка). Па словах кіраўніка гаспадаркі, дырэкцыя завода, якая займаецца рамонтам, абяцае прывезці фарсунку на працягу тыдня. Сушка збожжа на момант візіту кантралёраў праводзілася на зернесушылцы «КЗС-20», на збожжатаку было каля 320 тон збожжа, якое ў бліжэйшы час можа «згарэць» на сонцы...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## МАХЛЯРКА ЗАБІЛА БАБУЛЮ

**Віцебская 81-гадовая жанчына была забіта зладзейкай, якая нібыта хацела зняць у яе жыллё.**

— Як высветлілася падчас расследавання крымінальнай справы, 23-гадовая цыганка зайшла ў кватэру бабулі дзеля таго, каб, быццам бы, зняць пакой. І калі пенсіянерка на момант адлучылася з пакою, госця пачала шукаць у мэблі грошы, — расказвае Аксана Балеева, начальнік аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах пракуратуры Віцебскай вобласці. — У кашальку знайшла 150 тысяч рублёў. На той момант бабуля якраз вярнулася і ўбачыла, што ў яе скралі грошы. Пачалася бойка. Бабуля палкай зламала зладзейцы нос. Потым гаспадыня ўзяла ў рукі «рарытэтны» прас. Зламысніца адабрала прас і забіла бабулю. Прыгаворам суда забойцу пазбавілі волі тэрмінам на 12 гадоў. Суд пры вынясенні прыгавору ўлічыў, што яна выхоўвае малалетняе дзіця.

## ФАРБАВАЎ І ЗВАЛІЎСЯ Ў СКЛЕП

**У Віцебску мужчына фарбаваў прыватны дом прадпрымальніка і ўпаў у склеп глыбінёй каля 2,5 м. Гэты 33-гадовы непрацуючы жыхар Віцебска быў наняты гаспадаром дома для правядзення будаўнічых работ.**

Пацярпелага выратавальнікі дасталі са склепа і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. З закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і траўмай жывата выратаваны быў шпіталізаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЦЯЖКАЯ ВАДА

**За тыдзень у Магілёўскай вобласці патанулі 18 чалавек, 14 з іх былі ў нецвярозым стане. Больш аптымістычная статыстыка: супрацоўнікі таварыства ратавання на водах у рэгіёне выцягнулі жывымі з вады 17 чалавек, з іх — 6 дзяцей.**

Расказваюць пра выпадак, калі Пячэрскае возера ў Магілёве спрабаваў пераплыць нецвярозы 16-гадовы падлетак. Добра, што выратавальнікі паспелі раней, чым магло б здарыцца няшчасце.

Мужчына 58 гадоў у час адпачынку з кампаніяй, будучы нападпітку, вырашыў асвяжыцца ў Дняпры: нырнуў у ваду, паказаўся на паверхні, зноў нырнуў — і больш яго жывым не бачылі... Вадалазы паднялі са дна ракі цела тапельца. З прычыны падобнага «п'янага» купання ў Дняпры патануў 36-гадовы магіляўчанін: адплыў на дзясятак метраў, узмахнуў рукой і... знік.

У Касцюковіцкім раёне на рацэ Бесядзь 26 ліпеня таксама здарылася трагедыя. Там патануў 5-гадовы хлопчык: малы не ўмеў плаваць, але, пакуль сваяк займаўся іншымі дзецьмі, сам палез у ваду.

Дарослых людзей заклікаюць не купацца п'янымі і ўважліва сачыць за сваімі дзецьмі падчас адпачынку каля вадаёмаў.

## НЕ ПРЫШПІЛІЎ ЖЫЦЦЁ

У Магілёўскім раёне паблізу вёскі Таўпечыцы 28 ліпеня адбылася аўтамабільная аварыя. Паводле інфармацыі ДАІ, аўтамабіль «Опель» выехаў на абочыну і перакуліўся. За рулём быў 34-гадовы жыхар Магілёва, які не справіўся з кіраваннем і атрымаў у выніку смяротную траўму. Мяркуюць, што мужчына мог быў выжыць, калі б быў прышпілены рэменем бяспекі, але ён ім не скарыстаўся.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО КОНКУРСУ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГРОДНООБЛАВТОТРАНС»

| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 |
|---|---|---|---|---|
